Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 10 (889) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 11 САКАВІКА 1973 г. ЦАНА 60 гр.

НА НІВЕ БГКТ



Сёння мы хочам прадставіць у кароткім рэпартажы жыццё, працу і людзей гуртка Беларускага таварыства, які з'яўляецца ў Міхалове моцным звяном і ўсё больш займае належнае сабе месца ў гэтым рухлівым і неспакойным мястэчку.

Міхалоўскі гуртох БГКТ адзін з большых — налічвае 43 члены. Людзі гуртка — гэта працаўнікі мясцовай кравецкай майстэрні, дома культуры, ГС, рознага роду індывідуальныя майстры і гаспадары.

Плануецца ў Міхалове стварыць філіялы гуртка ў ПОМ-е і МБМ-е, дзе працуюць актыўныя групы членаў БГКТ, а задалёка ім хадзіць на агульныя сходы гуртка ў Міхалове.

У ПОМ-е вельмі актыўна працаваў пару год Юзэф Пашкевіч артыст-самадзейнік, дасканалы гумарыст. Гэта ён падрыхтаваў базу ў ПОМ-е для будучага філіялу беларускага гуртка. Цяпер Юзік Пашкевіч у арміі і адчуваецца крыху, што яго няма, як у гуртку БГКТ, так і ў драматычным беларускім гуртку, які вырас і сфарміраваўся па ініцыятыве і дапамозе гуртка БГКТ, а рэпетыцыі праводзіць у доме культуры.


Ёсць у міхалоўскім асяроддзі вялікія групы здольных і ахвотных да працы на культурнай ніве людзей. Аказалася, што Міхалова мае здольных дэкламатараў, майстроў жывога слова, здольных песняроў. Міхалоўскі гуртох прымае ўдзел у кожным аглядзе Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Прыходзяць у гурток усё новыя людзі.

На агляд драматычных калектываў з беларускім рэпертуарам у 1973 годзе Міхалова падрыхтавала «Трыбунал» Андрэя Макаёнка. Прыпомнім, што гэтая п'еса ставіцца якраз беластоцкім драматычным тэатрам і карыстаецца вялікай папулярнасцю ў гледачоў. Аб міхалоўскай прэм'еры «Трыбунала» будзем пісаць і ацэньваць яе асобна, а тут скажам толькі, што факт пастаноўкі «Трыбунала» аматарскім гуртком — гэта вялікае здарэнне і для Міхалова і для дзейнасці БГКТ. П'есу рыхтавалі калектыўна: Валя Казімерчык, інструктар міхалоўскага ГОК-у, была рэжысёрам па мове і захаванні рэаліяў п'есы. Рышард Варабей вёў нагляд над правільнай пастаноўкай. А для агульнага рэжысёрскага нагляду Міхалова папрасіла спецыяліста па тэатру з Ваяводскага дома культуры ў Беластоку — Ізу Пултарак.

(Працяг на стар. 4)



Валянціна Казімерчык — інструктар гміннага цэнтра культуры ў Міхалове. Гэта высокая і шчуплая дзяўчына з'яўляецца задушэўным і ўражлівым культурным дзеячом. Народжаная ў ваколіцах Міхалова, ведае тутэйшых людзей, шануе іх і цэніць іх таленты.



Сямейны здымак старшыні гуртка БГКТ у Міхалове — Антона Саковіча, побач жонка Анна і ўнучка Кася. Пра Антона Саковіча гаворыцца ў Міхалове «душа калектыву».



Два каменныя сфінксы бароняць уваход у сядзібу прэзідыума ПРН у Сямяцічах. Засталіся яны там у спадчыне пасля даўнейшай уласніцы горада Сямяцічы і шматлікіх іншых гарадоў і вёсак, пасля — княжны Анны Ябланоўскай, якая жыла ў гадах 1728—1800, а сваю галоўную сядзібу, свой палац мела якраз там, дзе некалькі год таму назад павятовыя ўлады пабудавалі сабе адміністрацыйны будынак. У час яго будовы было шмат клопатаў, кажуць, што нават адна сцяна завалілася. Тады ў Сямяцічах пачалі шаптаць, што гэта дух княжны не дапускае прадстаўнікоў дэмакратычнай улады на развалінах свайго палаца.

Цяжка гэтаму паверыць, бо гісторыкі даказваюць, што княжна, хаця багатая, як мала хто ў той час, адзначалася прагрэсіўным светапоглядам і дэмакратычнымі адносінамі да сваіх падуладных. Асабліва дбала яна аб тым, каб яе сяляне і эканомы прымянялі навейшыя ў тагачасных умовах метады вядзення гаспадаркі.

Гэта ўсё пра княжну Ябланоўскую ўспомнілася мне, калі я сядзеў у прасторнай канферэнцыйнай зале прэзідыума ПРН у Сямяцічах. Адбывалася якраз сесія рады. Ішла гутарка аб метадах і спосабах інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі.

Слухаючы аб ліках, планах і намаганнях мясцовых дзеячоў, гляну ў я праз акно на гэтых адноўленых сфінксаў. Раптам здалося мне, што адзін з іх як бы патрос сваёй грывай і адзваўся:

— Чувае, калега? Зноў пра сельскую гаспадарку.

— Надакучыла ўжо слухаць! — абурыўся другі сфінкс. — Пастаянна гэта інтэнсіфікацыя!

— Чакай, прымкніся! — разазлосціўся першы. — Чуеш? Цяпер штосьці пра бараноў.

— Ага, сапраўды.

За трыбунай стаяў прадстаўнік спулдзельні прадукцыйнай з Вулькі Нурэцкай і гаварыў аб баранах. У наваколлі Мельніка, гаварыў, знаходзяцца вялікія абшары дзяржаўнага фонду зямлі. (Гэта таксама колішняя ўласнасць княжны Ябланоўскай). Доўгі час павятовыя ўлады не ведалі, што ім рабіць з гэтым зямельным багаццем. Поле ляжала аблогам, парастала лесам і пустазеллем.

Спулдзельня прадукцыйная з Вулькі Нурэцкай, якая вось ужо 20 гадоў гаспадарыць на супольным, рашыла прыняць гэтую зямлю ў сваё ўладанне і абсталяваць у Мельніку буйную ферму па гадоўлі авечак. Зямлі там многа, аж 1250 гектараў, дык прастору і пашы хопіць больш чым для 3 500 авечак і бараноў. Спулдзельня спадзяецца высокага прыбытку, бо мода на баранія кажухі пакуль што не мінае, за вайну плоцаць многа, а і авечае мяса таксама штосьці вартае. Цікава толькі, ці ў Мельніку будуць даіць авечак і выраблць гуральскую брынзу? Трэба было б тады групу спулдзельцаў з Вулькі паслаць на «ўчасы» ў горы, каб ад тамашніх бацаў навучыліся тэхніцы даення авечак, бо ў нас на Беласточчыне яшчэ дагэтуль лічаць авечку стварэннем безмалочным, якога даіць не варта, ды і сорамна.

— Чуеш? — адазваўся адзін са сфінксаў. — Цяпер яны пра сады.

— Для нас гэта не навіна. — пагардліва сказаў яго каменны калега. — Памятаеш, яшчэ наша пані вучыла садзіць яблыні і слівы.

— Ясна, — згадзіўся першы. — Але ты не балбачы, бо нічога не чую.

Пад яблынямі, грушамі, слівамі ды іншымі фруктовымі дрэвамі, як вынікала з дакладу старшыні, знаходзіцца ў Сямяціцкім павеце амаль 288 гектараў зямлі. Здавалася б, што многа, але гэтыя яблыні ды грушы раскінуты па

(Працяг на стар. 4)

БГКТ ХРОНІКА

■ На справаздачны сход гуртка БГКТ у Залуках (адбыўся 15.II.) былі запрошаны жыхары вёскі. Сабралася іх каля 90 чалавек. Старшыня гуртка Марыся Цыванюк прадставіла прысутным справаздачу аб дзейнасці гуртка ў 1972 годзе і план працы да канца бягучага года. Падчас дыскусіі інструктар ГП на Беластоцкі павет Геня Іванюк гаварыла аб заданнях БГКТ, а затым уручыла 33 асобам (якія раней падпісалі дэкларацыі) членскія легітымацыі. Выбраны быў новы скарбнік гуртка — Ірэна Грэсь. Марыся Цыванюк шмат папрацавала над тым, каб у дзень справаздачнага сходу адбыўся конкурс на найлепшых выканаўцаў песні. Былі падрыхтаваны сімвалічныя ўзнагароды. У гэтым конкурсе выступіла 14 чалавек. Першае месца заняла Антаніна Кміта, другое — Анна Філіпчук і трэцяе — Зіна Станкевіч.

■ 22 лютага адбылося пасяджэнне прэзідыума сакольскага аддзела БГКТ з удзелам старшыні ГП Мікалая Самоціка і старшыні галоўнай рэвізійнай камісіі Міхася Хмялеўскага. Супольна былі абмеркаваны задачы аддзела на бліжэйшы перыяд, у тым ліку распаўсюджванне выдавецтваў ГП і справы павелічэння падпіскі на «Ніву».


■ 23 лютага на нарадзе старшынь рэвізійных камісій праўленняў аддзелаў (шкада, што не ўсе старшыні прынялі ўдзел), былі намечаны заданні на бягучы год і абмеркавана роля гэтых камісій. Старшыня ГП Мікалай Самоцік прадставіў прысутным план працы БГКТ на першае паўгоддзе 1973 года.

■ 24 лютага гайнаўскі аддзел БГКТ, аддзел культуры ПРН супольна з уладамі гміны ў Чыжах арганізавалі ўрачысты вечар, прысвечаны 50-ай гадавіне СССР і 55-ай гадавіне Савецкай Арміі. З дакладамі выступілі дырэктар пачатковай школы ў Клейніках і сакратар прапаганды гміннага камітэта ПАРП у Чыжах Васіль Пучко, а таксама падпалкоўнік Ваяводскага штаба — Вацлаў Свяцкі. Затым пад загалоўкам «Што ведаеш аб краіне Саветаў» адбыўся конкурс, у якім прыняло ўдзел 11 асоб пазашкольнай моладзі — пераможцы вясковых эліміначый гэтага конкурсу. У мастацкай частцы выступаў харавы калектыў з Клейнік, а школьнікі з Чыжоў выступілі з літаратурна-музычным мантажом. Пасля ўсяго гэтага быў паказаны кінапрасоўкай ГП фільм «Сыновья уходят в бой». На гэтай урачыстасці партыйныя павятовыя ўлады прадстаўляў кіраўнік цэнтра прапаганды — Эдвард Лясота, ГП БГКТ — яго старшыня Мікалай Самоцік, а гайнаўскі аддзел БГКТ — старшыня Аляксандр Іванюк.

■ 25 лютага ў памяшканні ГП адбыўся пяцігадзінны конкурс «Беларуская песня — 73». Справаздачу аб ім надрукуем у наступным нумары «Нівы».

(мх)

◇Падзеі ◇ Здарэнні ◇ Факты ◇ Каментарыі ◇ Весткі



СВЕТ · БССР · ПОЛЬШЧА · ВАЯВОДСТВА

АКТ МІЖНАРОДНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

1 сакавіка г.г. на авеню Клебер адбылося пленарнае пасяджэнне 12 дэлегацый краін — удзельніц міжнароднай канферэнцыі па В'етнаму. На пасяджэнні парафіраваны канчатковы дакумент — акт міжнароднай канферэнцыі па В'етнаму. Гэты дакумент пацвярджае асноўныя нацыянальныя правы в'етнамскага народа — незалежнасць, суверэнітэт, адзінства і нацыянальную цэласнасць В'етнама.

Такім чынам, дзейнасць канферэнцыі, накіраваная на тое, каб замацаваць у міжнародным плане вынікі парыжскага пагаднення аб спыненні вайны і ўстанаўленні міру ў В'етнаме, закончылася поспехам.

Акт канферэнцыі, які складаецца з дзевяці артыкулаў, парафіравалі ўсе народы. І гэтым канферэнцыя адрозніваецца ад жэнеўскай канферэнцыі па В'етнаму, дакумента якой не падпісаў урад Злучаных Штатаў.

Канферэнцыя прызнала асноўнае нацыянальнае права в'етнамскага народа, незалежнасць, суверэнітэт, адзінства і нацыянальную цэласнасць В'етнама. Гэтым актам міжнародная канферэнцыя прыняла таксама да ведама абавязацельствы чатырох краін, чые подпісы стаяць пад парыжскім пагадненнем.

АБМЕН ПАРТЫЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

1 сакавіка ў КПСС пачалося правядзенне абмену партыйных дакументаў. Па традыцыі, якая ўстанавілася, партбілет узору 1973 года за нумарам першым быў выпісаны ў Цэнтральным Камітэце КПСС на імя Уладзіміра Ільіча Леніна — заснавальніка і правадыра Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Падпісаў ленінскі партыйны білет Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў.

З гэтага часу члены КПСС будуць атрымліваць партыйныя білеты з сілуэтам Уладзіміра Ільіча і яго пранікнёнымі словамі: партыя — розум, гонар і сумленне нашай эпохі.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

Прадстаўнікі савецкага Усесаюзнага аб'яднання «Тэхнапрамімпарт» і міланскага акцыянернага таварыства «Карле і Мантанары» падпісалі ў італьянскай сталіцы кантракт на пастаўку ў СССР буйнай партыі прамысловага абсталявання для прадпрыемстваў кандытарскай прамысловасці. Агульны кошт гэтага абсталявання ацэньваецца ў 4.600 тысяч рублёў.

«ЧОРНЫ ВЕРАСЕНЬ»...

...гэта арганізацыя, якая аб'ядноўвала пад сваім шыльдам невялікія экстрэмістычныя настаўленыя групоўкі палесцінцаў. У яе названні ёсць успамін аб крывавых сутычках паміж палесцінскімі атрадамі супраціўлення і іярданскай арміяй у верасні 1970 года.

У друку ніколі не выступалі даныя адносна колькасці, месцапрабывання ці кіраўніцтва гэтай арганізацыі, не публікавалася нідзе праграма яе дзейнасці. Аднак некаторыя факты гавораць аб сувязях «чорнага верасня» з некаторымі, экстрэмістычнымі непалесцінскімі кругамі. (ак)

ПЛЕНУМ ЦК КП БЕЛАРУСІ...

...адбыўся ў Мінску 26 лютага гэтага года. Яго ўдзельнікі абмеркавалі выкананне рашэнняў XXIV з'езду КПСС і ўказанні снежаньскага (з 1972 г.) пленума ЦК КПСС па павышэнню эфектыўнасці прамысловай вытворчасці і задачах партыйных арганізацый БССР. Выступаючы са справаздачным дакладам, кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ таварыш П. М. Машэраў адзначыў, што мінулыя два гады пяцігодкі былі для працоўных Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюза гадамі самаадданай працы па рэалізацыі велічнай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, выпрацаванай XXIV з'ездам КПСС. Для прыкладу, аб'ём нацыянальнага даходу БССР павялічыўся за гэты час аж на 19 працэнтаў.

АБ С. ПРЫТЫЦКІМ

У сувязі з 60-ай гадавінай з дня нараджэння Сяргея Прытыцкага ў Гродзенскім абласным гісторыка-краязнаўчым музеі адкрылі экспазіцыю, якая расказвае аб жыцці і дзейнасці гэтага слаўнага сына беларускага народа. Шматлікія макеты, фатаграфіі і выразкі з газет паказваюць яго ў розныя перыяды жыцця і дзейнасці. Вялікі раздзел экспазіцыі займаюць матэрыялы аб дзейнасці Сяргея Прытыцкага на пасадзе Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

ШТУЧНАЕ ВОЗЕРА

Меліяратары саўгаса «Дабрынь» Ельскага раёна здалі ў эксплуатацыю штучнае возера, плошча якога 122 гектары. Яно будзе служыць як водазбор для арашэння палёў і культурнай пашы. У возеры будуць вырошчваць штогод да трохсот цэнтнераў рыбы, а на яго берагах узнікне лодачная станцыя і база для адпачынку.

ДЫНАСТЫЯ ЗЕМЛЯРОБАЎ

Продкі Станіслава і Алёны Шыдлоўскіх выводзіліся з земляробаў, яны самі таксама былі земляробамі і іх дзеці рашылі працаваць на зямлі. Сыны Рычард і Генадзь закончылі Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут. Рычард Шыдлоўскі ўзначальвае зараз саўгас «Гарадзішчанскі», а Генадзь Шыдлоўскі з'яўляецца старшынёй калгаса «Прагрэс». Трэці сын Шыдлоўскіх, Раман, скончыў Мінскі тэхналагічны інстытут і стаў інжынерам-механізатарам. Дачка Людміла пасля заканчэння інстытута народнай гаспадаркі працуе эканамістам у саўгасе «Варонча», Карэліцкага раёна.

БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦТВА Ў ЯПОНІІ

Ёко Накамура, віцэ-прэзідэнт Такійскай мастацкай Галерэі Гекасо, дзе прадаюцца творы савецкага жывапісу, нядаўна асабіста пабывала ў Мінску і выбрала каля 100 палотнаў беларускіх мастакоў. Сярод іх апынуліся працы народнага мастацтва БССР Я. Зайцава, заслужаных дзеячоў мастацтва БССР П. Масленікава, А. Шыбіна, Р. Кудрэвіча і іншых. Гэтыя карціны будуць паказаны ў Галерэі Гекасо і прапанаваны для пакупкі японскім любіцелям савецкага жывапісу. Ёко Накамура высока ацаніла мастацкую вартасць палотнаў беларускіх мастакоў. (вр)

ЗАГІНУЎ ТАВ. В. АЦЕПКА — МІНІСТР УНУТРАНЫХ СПРАЎ

Сумным здарэннем мінулага тыдня, якое парушыла краіну, была трагічная смерць нашага міністра ўнутраных спраў тав. Веслава Ацепкі, які загінуў у авіяцыйнай катастрофе ля Шчэціна. З ім загінулі міністр унутраных спраў Чэхаславакіі і група працаўнікоў міністэрства УС Чэхаславакіі і Польшчы. Прэм'ер стварыў спецыяльную камісію, каб высвятліць прычыны катастрофы. Пахаванне таварыша Ацепкі і яго таварышаў адбылося ў Варшаве на камунальных могілках на Павонзках. За труной загінуўшага міністра ішлі тав. тав. Э. Герэк, Г. Яблонскі, П. Ярашэвіч і шматлікія дэлегацыі.

Тав. Веслава Ацепку помніць актыў БГКТ. Працуючы яшчэ ў ЦК партыі, ён апекаваўся нашым таварыствам і прыязджаў у Беласток на з'езд БГКТ. Запомніўся нам, як сардэчны, з цёплымі адносінамі да іншых, чалавек.

VIII ПЛЕНУМ ЦК ПАРТЫІ

Пад кіраўніцтвам I сакратара ЦК ПАРП тав. Э. Герка адбыўся VIII пленум ЦК. Яго тэма: эфектыўнае выкарыстанне сыравіны і матэрыялаў. Рэч ідзе пра тое, каб сыравінай і матэрыяламі гаспадарыць ашчадна і разумна. Не нішчыць іх, асабліва ў будаўніцтве шукаць такіх тэхналагічных вырашэнняў, якія б дазволілі зменшыць колькасць выкарыстоўваемых матэрыялаў. Дыскусія пра гаспадаранне матэрыялам у краіне не закончылася на VIII пленуме партыі. Пра гэта трэба дбаць пастаянна і ўсім у штодзённым жыцці. Калі будзем больш ашчадныя, больш пабудуем, будзем багацейшыя.

ПРА ГС-Ы

«Спулдзельчасць заапатшэння і збыту» — гэта ўстанова, галоўным заданнем якой будзе дапамога вёсцы. У скарачэнні гаворым «вясковая спулдзельчасць». Адбыўся восьмы VI кангрэс гэтай спулдзельчасці. Ён накрэсліў праграму лепшай чым дагэтуль працы на карысць вёскі. Вясковая спулдзельчасць у сваёй службе гаспадарам не паспявае яшчэ за атульнымі, вельмі хуткімі, зменамі. А гаспадары змяняюцца — усё лепш і больш прадукуюць. Галоўная задача вясковай спулдзельчасці цяпер — гэта лепш і хутчэй абслугоўваць вёску, дастаўляць ёй хутчэй і багацейшы асартымент тавараў і машын. Спраўней таксама трэба купляць ад вёскі яе плёны.

ЯК БУДЗЕМ ВУЧЫЦЦА?

Ад сакавіка пачалася ўсеагульная дыскусія над «Рапартам аб стане асветы», апрацаваным групай экспертаў пад кіраўніцтвам праф. Шчэпанскага. Асновай для дыскусіі з'яўляюцца пастановы VI з'езду партыі ў раздзеле аб выхаваўча-асветнай палітыцы, пастановы VII пленума ЦК ПАРП. Чакае нас вялікая рэформа асветы. Які вобраз нашай асветы рысуецца? 1) Увойдзе сярэдняя адукацыя для ўсіх, 2) усе настаўнікі будуць мець вышэйшую адукацыю, 3) будуць арганізаваны прафесіянальныя школы, у якіх будуць вучыцца высокакваліфікаваныя кадры, 4) будзе павышаны ўзровень навучання ва ўсіх школах. (вл)

КАБ ЛЕПШ

1 сакавіка закончылася ў Ваяводскім камітэце ПАРП у Беластоку двухдзённая курсаканферэнцыя, у якой прымалі ўдзел сакратары павятовых камітэтаў ПАРП, кіраўнікі і намеснікі кіраўнікоў аддзелаў ВК ПАРП, а таксама члены Прэзідыума ВРН. Галоўнай мэтай сустрэчы была дыскусія над магчымасцямі яшчэ большага паляпшэння партыйнай працы на Беласточчыне. Выступалі сакратары ВК ПАРП у Беластоку Здзіслаў Куроўскі, Уладзіслаў Юшкевіч, Стэфан Завадзінскі, Яўгеніюш Златажынскі, Міхал Недзведзь. «Партыя, — сказаў тав. З. Куроўскі, — павінна даваць прыклад і быць насіцелем высокай культуры і добрай арганізацыі працы».

ГОСЦІ З «ЗЯМЛІ БЕЛАСТОЦКАЙ» НА БЕЛАСТОЦКАЙ ЗЯМЛІ

Упершыню, але бадай не апошні раз пабываў на Беласточчыне экіпаж карабля «Зямля беластоцкая». Як вядома, карабль быў пабудаваны ў Балгарыі, на суднаверфі імя Г. Дзімітрава ў Варне. Яго хроснай маці была пасол Беласточчыны ў Сейм Анна Келч. Ад 1 жніўня карабль рэгулярна курсуе ў Італію, Іспанію, Афрыку, Нарвегію і інш.

Госці сустрэліся з прадстаўнікамі ваяводскіх улад, пазнаёміліся з Беластокам, Белавежай і Гайнаўскім прадпрыемствам драўнінных прамысловасці.

Маракі паабяцалі, што будуць расслаўляць прыгажосць Беласточчыны ва ўсіх кутках зямнога шара. Капітан карабля быў запрошаны ў арганізацыйны камітэт ствараючагася беластоцкага запарка.

ПЕРАХОДНЫ СЦЯГ — У БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

26 лютага адбылася ў Беластоку нарада ваяводскага актыву ОРМО. У нарадзе прымалі ўдзел сакратар ВК Уладзіслаў Юшкевіч, намеснік старшыні Прэзідыума ВРН Ежы Зентара і ваяводскі камендант МО палкоўнік Бернард Нарэнгоўскі. У даны момант на Беласточчыне ёсць 11.600 армоўцаў, а ў іх ліку 447 жанчын. У мінулым годзе ўсе яны былі на службе 1.400 000 гадзін, затрымалі 378 злачынцаў, выкрылі 31 800 парушэнняў публічнага парадку.

У спаборніцтве павятовых арганізацый ОРМО першае месца занялі армоўцы з Бельскага павету. Яны атрымалі пераходны сцяг старшыні Прэзідыума ВРН.

У ЛАПАХ — НОВАЯ БАЛЬНІЦА

У суботу, 3 сакавіка жыхары Лап атрымалі новую бальніцу. Адкрыццё бальніцы было вельмі ўрачыстае, паколькі лапская бальніца была прызнана «найлепш выкананым аб'ектам 1972 года». Прыбылі міністр здароўя і грамадскай апекі Марыян Слівінскі, I сакратар ВК ПАРП Здзіслаў Куроўскі, а таксама старшыня Прэзідыума ВРН Зыгмунт Спрыха. Сярод ганаровых гасцей былі таксама галоўная праектантка бальніцы архітэктар Галіна Баер-Сувальская і кіраўнік будовы Мікалай Радзішэўскі. (ач)



NIEDZIELA 11.III.

7.40 Program dnia. 7.45 TV Kurs Rolniczy. 8.20 „Przypominamy, radzimy". 8.30 „Nowoczesność w domu i zagrodzie". 9.00 TELERANEK. 10.20 „Antena". 10.35 Gra Orkiestra TV Katowice. 10.55 „U źródeł polskiej sztuki współczesnej" („W kręgu mistrzów sztuki"). 11.25 PKF. 11.35 „W starym kinie" — Listy miłosne Kazimierza Junoszy-Stepowskiego do Mary. 12.35 Dziennik. 12.50 Sprawozdanie z II połowy meczu piłki nożnej Legia (Warszawa) — Lech (Poznań) o Mistrzostwo I Ligi. 13.45. „Przemiany". 14.15 Dla dzieci: L. J. Kern — „Wąsata katastrofa" cz. VI („Karampuk"). 14.45 Losowanie numerów Totolotka. 15.00 „Pióropusz czy korona" — rep. film. z II Światowego Festiwalu Polonijnych Zespołów Artystycznych — Rzeszów 72. 15.40 „Sławne Polki" — teleturniej. 16.30 „Znakiem ich było Rodło" — film dok. 17.00 Sportowy magazyn sprawozdawczy. 18.20 „Tele-Echo". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Wojna i pokój" — film fab. radz. cz. III — „Rok 1812". 21.25 „Gromnicki show". 22.00 Magazyn sportowy.

PONIEDZIAŁEK 12.III.

12.45 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Uprawa Roślin. 15.20 i 22.55 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Fizyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Zwierzyniec". 17.25 „Echo stadionu". 17.50 TV Kurier Białostocki. 18.10 „Oferty". 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Eureka". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr TV: L. Kruczkowski — „Pierwszy dzień wolności". 21.25 Publicystyka międzynarodowa. 21.55 „Karnawał". 22.30 Dziennik.

WTOREK 13.III.

10.00 „Wojna i pokój" — film fab. radz. cz. III — „Rok 1812". 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEWIZJA MŁODYCH. 18.10 Śpiewa Nadia Urbankowa. 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 „Morskie spotkania". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Pan Dodek" — film fab. pol. 21.30 „Spotkanie z pisarzem — Piotrem Wojciechowskim". 22.00 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.30 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 23.05 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin.

ŚRODA 14.III.

8.30 „Pan Dodek" — film fab. pol. 9.55 Dla szkół: (kl. VI) Fizyka — „Ciśnienie atmosferyczne. 10.55. Dla szkół: (kl. VII—VIII) Wychowanie obywatelskie — „Budowle zabytkowe". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt. 14.00 „Wybieramy zawód". 15.20 i 22.45 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Matematyka. 16.25 Program dnia 16.30 Dziennik. 16.40 Dla dzieci: „Złote wrota" — teatrzyk piosenki dziecięcej TV Słowackiej. 17.30 „Informacje, Towary, Propozycje". 17.50 „Przez Afrykę" — film dok. czechosł. odc. III. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Starty" —publ. młodz. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Studio 63: M. Żuławski — „Kluski z makiem" („Opowieści mojej żony"). 20.20 „Białe lilie" — film franc. („Szpieg cesarza") odc. V. 21.15 „Pryzmat" — program publ. 21.45 „Król się bawi" („Balet"). 22.15 Dziennik. Wiadomości sportowe.

CZWARTEK 15.III.

9.00 Dla szkół: (kl. VII) Chemia — „Żółty skarb". 10.25 Dla szkół: (kl. VI) Historia — „Ten, który odważył się być mądrym". 10.55 „Białe lilie" — film franc. („Szpieg cesarza") odc. V. 12.45 Dla szkół: (kl. II—IV lic.) Język polski — „List". 14.00 Matematyka w szkole: „Rozszerzanie zakresu liczb". 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem". 17.45 PKF. 17.55 Śpiewa Maryla Rodowicz. 18.25 TV Kurier Mazowiecki. 18.45 „Poligon". 19.15 „Przypominamy, radzimy". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Nieśmiertelny" — film fab. USA. 21.15 „Refleksje". 21.45 „Kobieta rajska" („Wieczorowy Uniwersytet dla Starszych Panów"). 22.15 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.45 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 23.20 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt.

PIĄTEK 16.III.

8.40 „Nieśmiertelny" — film fab. USA. 9.55 Dla szkół: (kl. VI) Geografia — „Z syreną w herbie". 10.55 Dla szkół: (kl. VII-VIII) Wychowanie techniczne — „Dziewiarstwo ręczne". 11.55 Dla szkół: (kl. VIII) Chemia — „Woda". 12.45 TV Technikum Rolnicze: Chemia. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Mechanizacja Rolnictwa. 15.20 i 23.00 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Rysunek techniczny. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora". 17.25 „Nie tylko dla pań". 17.45 „Gramy o telewizor" — teleturniej. 18.10 „Turystyka i wypoczynek". 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Perspektywy techniki". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Canzonissima" — program rozr. wł. 20.45 Panorama Tygodnia. 21.25 Studio 63: Z. Herbert — „Drugi pokój". 22.00 Magazyn medyczny. 22.30 Dziennik. Wiadomości sportowe.

SOBOTA 17.III.

7.50 „Markiza Angelika" — film fab. franc. 9.55 Dla szkół: (kl. VII) Zoologia — „Gady". 10.55 Dla szkół: (kl. VIII) Nauka o człowieku — „Układ nerwowy". 12.00 Sprawozdanie z Międzynarodowych zawodów narciarskich o Memoriał Bronisława Czecha i Heleny Marusarzówny. Otwarty konkurs skoków (Zakopane). 14.20 TV Technikum Rolnicze: Chemia. 14.55 TV Technikum Rolnicze: Mechanizacja rolnictwa. 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.05 Telereklama. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Dwie orkiestry". 17.10 Dla dzieci: ((Zielona". 17.40 Leningradzki balet na lodzie. 18.40 „Godzina Orfeusza". 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Alfabet rozrywki" — „S". 21.15 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.10 „Markiza Angelika" — film fab. franc.



Piątek, 9 marca

8.45 Film fab. 10.50 Szkoła szachowa. 11.20 Filmy dokument. 14.15 Program dnia. 16.40 Film animowany dla dzieci. 17.10 Śpiewa A. Ogincew. 17.50 Film fab. I seria. 19.00 Czas. 19.30 Film fab. II seria.

Sobota, 10 marca

7.00 Program dnia. 8.00 Film dokument. 9.00 Koncert. 10.15 Film fab. 11.00 Filmy animowane. 11.30 Przegląd międzynarodowy 11.45 Mozaika muzyczna. 13.45 Film fab. 17.00 Wieczór autorski Chrennikowa. Transmisja z Pałacu Zjazdów. 20.00 Transmisja z zawodów gimnastycznych. 20.45 Halowe lekkoatletyczne mistrzostwa Europy.

Niedziela, 11 marca

7.00 Program dnia. 8.00 Dla żołnierzy. 8.30 Kiosk muzyczny. 9.30 Spektakl TV. 11.40 Tańczcie z nami. 12.05 Konkurs piosenkarski. 14.15 Spotkania literackie. 15.00 Klub filmowy. 16.10 Film animowany. 17.00 Film fab. 18.15 Zawody gimnastyczne. 19.00 Czas. 19.30 Panorama filmowa. 21.00 Halowe lekkoatletyczne mistrzostwa Europy.



А ў Кошках ціха

А чаму ціха? Ці ж даўно быў той час, калі сярэдняй велічыні вёска ў Бельскім павеце была слаўнай? Гаварылі пра яе ў розных цэнтральных установах. Яшчэ нядаўна «Трыбуна люду» дала здымак жанчыны, якая сядзіць пры кроснах, і подпіс, што гэтак ткуць маты ў вёсцы «Кокошкі». Перакруціў хтосьці назву, мо і таму, што назва гэтая перастала абазначаць цяпер нешта больш, чым назву адной з беластоцкіх вёсак.

Чаму гаворым: было так, ёсць інакш? Вёска Кошкі тчэ саламяныя маты на кроснах. Інакш кажучы, развілася і цвіце тут народная прамысловасць. Ёю зацікавіліся (цікавяцца далей), і пачала яе падтрымліваць «Цэпэлія», багатая ўстанова, якая купляе ад вытворцаў і прадае ў краіне і за граніцу розныя вырабы народных умельцаў, у тым ліку маты, кашы з саломы, гаршкі-сівакі і гэтак далей. Якраз у названых вырабах Беласточчына з'яўляецца цэнтрам, а ў беластоцкім цэнтры — паветы Гайнаўскі і Бельскі. Вырабы з саломы занялі тут найбольш месца і даволі заглянуць у бельскі магазін народных вырабаў, каб пабачыць, чаго толькі не зробяць нашы людзі з саломы — нават хаткі для шпакоў — сапраўдныя цацкі.

«Цэпэлія» багатая. Ёсць у яе грошы на культурную дзейнасць сярод сваіх членаў і дастаўшчыкаў. Ласкавым вокам глянула некалі «Цэпэлія» на Кошкі і суседнія вёскі. Зрабіла і абсталявала ў Кошках святліцу. (Было гучнае і ўрачыстае яе адкрыццё). Стварыла хор, аплачвала дырыжора. Усе, што да аднаго з Кошкаў з'яўляюцца членамі «Цэпэліі», усе, што да аднаго ткуць тут маты, нават самотны — дзядзька Пятро Плуг. Многа было надзеі, што кошкаўская святліца стане цэнтрам культуры для ваколіцы, што народны хор у Кошках будзе спяваць і спяваць.

А я хачу прызнацца табе, дарагі чытач з Кошкаў і з іншых мясцовасцей, што я сумнявалася, ці гучна распачатая ў Кошках культурная дзейнасць будзе тут бурна развівацца. Чаму сумнявалася — зараз раскажу. Заспяваў тады на пачатку той кошкаўскі хор песні — гуральскія, мазавецкія. Нават няўмела харысты вымаўлялі па-гуральску і мазавецку словы. Усе цешыліся, смяяліся, што так смешна выходзіць, што так культурна, што так па-народнаму. А потым пайшлі тыя ж госці ў вясковую беларускую хату ў гасціну. Тут падалі кошкаўскія бабы ежу. І тады першы раз госцям збялелі вочы, бо першы раз яны адкрылі абычаі, якіх не бачылі. Яшчэ потым мясцовыя жанчыны пашапталіся і заспявалі песню — адну, другую, трэцюю. Гасцям другі раз збялелі вочы, бо яны другі раз адкрылі штосьці, чаго не чулі. І не смяяліся цяпер, а былі сур'ёзныя. З якім натхненнем і сілай спяваў гэты неарганізаваны хор свае песні — беларускія. Яны не ўваходзілі ў праграму таго хору пры святліцы. (А чаму?) І тады, я ўсумнілася, што цэпэльеўскі кошкаўскі хор будзе доўгавечны. Згода, трэба вывучаць і спяваць розныя песні, але ядро кожнага хору ці калектыву павінна быць сваё. Уласным непаўторным пульсам павінна пульсаваць жыццё кожнага мастацкага калектыву. Тады толькі ён мае сэнс існавання і будзе падабацца. У тым і заключаецца істота рэгіянальнай культурнай дзейнасці, каб не паўтараць таго, што гуральскі калектыў выканае дасканала, а выконваць уласнае і паказваць яго іншым.

Цяпер не сходзяцца людзі з Кошкаў у сваю святліцу. Работа ў хаце, летам у полі, маладых няма — гэтак кажуць. Толькі зноў пытанне, хто малады? Ці толькі 15—20-годкі? А 40—50-годкі таксама будуць маладыя, калі любяць працаваць, любяць чын і рух. Гэтак якраз расцэньвае справу маладая жанчына родам з Грэдалёў, а замужам у Кошках, маці трох малых дзяцей — Надзя Бурак: «Нязграныя маладыя, сядзяць па хатах, нават на сход гуртка БГКТ, калі робіцца, не прыходзяць». І далей успамінае, што калісь было інакш. У яе роднай вёсцы Грэдалях быў слаўны драмгурток і песні гучэлі. Сама Надзя прымала актыўны ўдзел. Дружна жылося і дружна працавалася!

Маладзенькая Тоня Бурак з'яўляецца светліцовай у Кошках. Другая маладзенькая дзяўчына Яўгенія Фёнік з'яўляецца старшынёю гуртка ЗМВ. Значыць, ёсць маладыя ў вёсцы.

Вельмі прыемна ішла размова ў хаце Івана Бурака з яго дачкой Тоняй і жонкай Аннай. Расказвалі многа цікавых рэчаў з жыцця вёскі. А ўсё ж фактам бясспрэчным астаецца тое, што ціха цяпер у вёсцы Кошкі, і нічога не варушыцца на культурнай ніве.

Калі ўспомніла я пра апісаны раней факт, як жанчыны спявалі беларускія песні, Анна Бурак сумна паведаміла, што тых найбольш пявучых ужо няма. Адышлі разам з песнямі. І святліца пустуе, хоць кругом жывуць людзі, якія таксама маглі б пачаць спяваць нашы песні і ставіць п'есы, арганізаваць мастацкія выступленні кругом па вёсках, а не закопваць свае таленты ў зямлю.

Аднак не магу закончыць гэтага артыкула сумна. Як многія іншыя, і я хачу верыць у Кошкі, у Грэдалі, што адазвуцца яшчэ гучным голасам. Я заказваю першую песню «Ой, бярозы ды сосны». *Вера Леўчук*

З жыцця аддзела БГКТ у Гданьску

17 лютага адбыўся агульны сход членаў БГКТ у Гданьску.

Абмяркоўваліся таксама справы, звязаныя з працай у 1972 г. і праграмай дзейнасці ў 1973 годзе.

Сход адкрыў старшыня Янка Мацкевіч. Прысутныя мінутай цішыні ўшанавалі памяць трагічна памёршага 27 чэрвеня 1972 года Пятра Малмышкі, актыўнага дзеяча аддзела, аднаго з яго арганізатараў. Аб дасягненнях аддзела ў мінулым годзе гаварыла сакратар, Анна Красько. Яна звярнула ўвагу на прыкметны ўздым у жыцці беларускага асяроддзя ў Гданьску, выкліканы мерапрыемствамі з нагоды знамянальных літаратурных гадавін, якія ўрачыста адзначаліся аддзелам.

Аб планах дзейнасці на гэты год гаварыў член праўлення Янка Міхайлаў. Вакол гэтай праграмы разгарнулася ажыўленая дыскусія.

Вырашана, у прыватнасці, арганізаваць конкурс на беларускую песню. Аддзел ужо ўключаецца ў адзначэнне 500-годдзя з дня нараджэння Мікалая Каперніка. Вырашана арганізаваць спецыяльны вечар, прысвечаны гэтай падзеі. Усе горача прывіталі прапанову, каб праведзены быў збор складчын на нацыянальны фонд аховы здароўя.

Падчас сходу былі выбраны ў склад праўлення яшчэ Раіса Драшчук і Мацей Канапацкі.

На заканчэнне Я. Мацкевіч уручыў 16 новым членам БГКТ членскія білеты.

Пасля сходу адбылася танцавальная частка. *(эмка)*

Беларускія радыёперадачы ў сераду

Зменены дзень і гадзіны беларускіх перадач беластоцкага радыёвяшчання. Замест панядзелка, будуць яны адбывацца па серадах ад гадзіны 8^{15} да 8^{30}.



Плён белавежскай глебы

«Майго дзяцінства і юнацтва
Не аддзялялі боты
Ад зямлі».

Алесь Барскі

Кніжачка невялічкая, усяго 118 старонак і фармат малы, а якая дарагачаканая на Беласточчыне! Выпусціла яе ў свет мінскае выдавецтва «Мастацкая літаратура»*), якое прадставіла даволі шырокаму кругу беларускага чытача (тыраж 2000 экземпляраў) выбраныя творы 17 аўтараў — паэтаў і празаікаў, пішучых у Польшчы на беларускай мове (Антось з Лепля, Алесь Барскі, Васіль Баршчэўскі, Яша Бурш, Мікола Гайдук, Уладзімір Гайдук, Юрка Геніуш, Уладзіслаў Дваракоўскі, С. Застэвін, Уладзімір Паўлючук, Віктар Рудчык, Алесь Свісёк, Ягор Хлябіч, Ян Чыквін, Дзмітрый Шатыловіч, Віктар Швед, Сакрат Яновіч).

У кароткім слове-ўступе да зборніка «Літаратурная Беласточчына» Уладзімір Казбярук называе творы нашых аўтараў «песнямі Белавежы». І, думаецца, справа тут не столькі ў тым, што якраз «Белавежай» называецца беларускае літаратурна-мастацкае аб'яднанне ў Польшчы, колькі ў тым, што, сапраўды, творчасць гэтых аўтараў у асноўным нарадзілася пад уплывам белавежскіх матываў і непадкупнага характара роднай прыроды, нарадзілася з замілаваннем да сваёй хаты, да зямлі, да людзей, сярод якіх аўтарам давялося жыць і ставіць першыя сур'ёзныя крокі ў жыцці. Большасць з іх жа і нарадзілася тут, на Беласточчыне, і хаця лёс кідае іх «у розныя стораны свету», то сэрца заўсёды шукае пуцявіны «на родны бацькоўскі парог». Цікаўны чытач, зрэшты, можа глянуць у кароткі біяграфічны даведнік, змешчаны ў канцы кніжкі, і даведацца, што толькі тры асобы з семнаццаці не нарадзіліся на беластоцкай зямлі.

Творы, змешчаныя ў зборніку «Літаратурная Беласточчына», друкаваліся ў свой час на старонках «Нівы» або ў літаратурных альманахах, календарах, ці нават у паэтычных зборніках паасобных аўтараў, якія выдавала Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы. Так што для вернага чытача гэтых выданняў творы, змешчаныя ў зборніку, выдадзеным у Мінску, не новыя. Сабраныя ў адну цэласць аднак, яны могуць даць больш поўны вобраз беларускага літаратурнага руху на Беласточчыне.

І калі хто возьме гэту з вялікім густам аформленую, бежавага колеру, з элементам народнага ўзору на вокладцы кніжачку ў рукі, ды перагорне яе, напэўна падумае: «А ўсё ж «Белавежа» выхавала сапраўдныя індывідуальнасці». І будзе мець рацыю. Аб кожным аўтары (ці то гаспадар ён на вёсцы, ці інжынер-электрык, ці выкладчык універсітэта) можна сказаць тут добрае слова.

А ўсё ж Алесю Барскаму («...найбольш прызнаны паэт з Беласточчыны», — піша Уладзімір Казбярук у прадмове) належалася ў зборніку бадай большае месца, тым больш, што з'яўляецца ён адным з нямногіх, талент якіх, здаецца, невычэрпны, і ён не толькі піша нястомна да сёння, але больш таго, лірыка яго становіцца ўсё больш сталай і насычанай грамадскімі праблемамі. Выдаў, зрэшты, ужо два зборнікі сваіх вершаў, а мо неўзабаве выйдзе і трэці.

Шкада, што справа выдання кніжкі «Літаратурная Беласточчына» крыху зацягнулася, і ў сучасны момант яна ўжо не адлюстроўвае актуальнага стану творчасці белавежцаў. Цяпер на літаратурнай старонцы «Белавежа» паяўляецца ўсё больш паэзіі, проза ж апошнім часам сышла да мінімума. Большая частка тых, што пісалі калісьці і творы якіх надрукаваны ў зборніку, перастала пісаць. Магчыма, заглыбіліся яны ў сваю прафесіянальную працу, з якой ядуць хлеб, а мо проста — гады ідуць, большасць аўтараў стала ўжо 40—50-годкамі, а паэзія, кажуць, прывілей маладосці. Творча актыўнымі да сёння засталіся з іх толькі Алесь Барскі, Ян Чыквін, Сакрат Яновіч, часамі дасылае свае вершы Уладзімір Гайдук. Хочацца аднак верыць, што ёсць яшчэ

(Працяг на стар. 6)

Боцькаўская моладзь вучыцца

Зала ГОК-у ў Боцьках запоўнена моладдзю. Сёння ў тэлевізіі «Акцыя-моладзь!» Гэта адна з форм асветна-палітычнай вучобы, якую вядзе ЗМВ. Тэлевізар пачынае псавацца з прычыны кепскай перадачы. Тэлевізар выключаюць, і далей заняткі павядзе Міхал Сац, настаўнік школы сельскагаспадарчай падрыхтоўкі. Яго ўступнае слова мае больш пытанняў, чымсьці даных. На пытанні будзе адказваць сабраўшаяся тут моладзь. Бо як будаваць другую Польшчу, у іх канкрэтных умовах, найлепш ведаюць яны самі — маладыя. Дзяўчаты гавораць аб упрыгожванні дамоў, сяліб. Хтосьці гаворыць аб пабудове аўтобуснага прыпынку, іншыя аб сельскай гаспадарцы, культурным жыцці.

У Боцьках зараз дзейнічаюць два гурткі ЗМВ, тэрэновы, які згуртоўвае 38 членаў, і пры ГС — 25 членаў. У мінулым годзе моладзь выконвала грамадскі чын пры пабудове паўстанка. Актыўна працуе Грамадская рада ГОК, а клуб у мінулым годзе заняў трэцяе месца ў ваяводстве ў катэгорыі клубаў, узнагароджаных у мінулых гадах.

Тэкст і фота А. Карпюк



Боцькаўская моладзь (у вопратцы, бо ў зале холадна зімою).



Міхал Сац. Уступнае слова ў часе заняткаў «Акцыя — моладзь»!

Міхалоўскі калейдаскоп

(Працяг са стар. 1)



Рышард Варабей, родам з Замброва, многія гады працуе ў культуры. Пару год таму прыняў кіраўніцтва міхалоўскага ГОК-у. Вялікі любіцель фальклору. Яго імкненне — зрабіць з Міхалова жывы і багаты культурны цэнтр, які б чэрпаў з невычэрпнай крыніцы народнай мудрасці.

Добра і цікава выглядаў удзел міхалоўскіх спевакоў у аглядзе «Беларуская песня — 73». Вось адна зваротка лёгкай фальклорнай песні (завучанай ад маці Анны Валкавыцкай з Таніцы), з якой выступіў сімпатычны дуэт маці і дачка — Ольга і Галіна Госцік.

У полі два дубочкі —
Абодва зяляненькі,
Любяць мяне хлопцы —
Абодва маладзенькі.

У праграмах, з якімі выступаюць міхалоўскія артысты, вельмі многа месца займае мясцовы фальклор. З яго рэдагуюцца прыпеўкі, гумарыстычныя маналогі, скетчы. Адлюстроўваюць яны звычаі тутэйшых жыхароў, іх штодзённыя гаспадарскія клопаты.

Нельга пісаць пра міхалоўскі гуртoк, не называючы хоць некалькі больш актыўных яго членаў. А да гэтых тут належаць: старшыня гуртка БГКТ Антон Саковіч, чалавек старэйшага ўзросту, які служыць радай і дапамогай маладым, а яны высока цэняць яго. Іван Палоцкі — скарбнік гуртка, верны актывіст БГКТ ад пачатку яго існавання. Ірэна Палех — член праўлення гуртка, актыўны ўдзельнік мастацкай дзейнасці, добры голас і прыгожа спявае. Муж і жонка Палоцкія — Ніна і Станіслаў, яна вядомая спявачка, ён дасканала грае ў п'есах. Членамі гуртка БГКТ з'яўляецца таксама Валя Казімерчык і Рышард Варабей.

Вера Леўчук

Фота Аляксея Карпюка



Сімпатычны дуэт — Ольга і Галя Госцік, «абедзве маладыя».

Пачатак на стар. 1

СФІНКСЫ І БАРАНЫ

садочках паасобных гаспадароў і большага гаспадарчага значэння яны не маюць. Гандлёвыя сады (ёсць іх усяго 34 га) знаходзяцца толькі ў Драгічыне і вакол гэтага горада, на прышкольных гаспадарках у Чартаеве і Астражанах, а таксама ў саміх Сямяцічах.

Сямяцiцкі павет — самы паўднёвы куток Беласточчыны. Там заўжды крыху цяплей, чым на поўначы ваяводства. Таму Сямяцiччына мае больш спрыяльныя ўмовы для развіцця садаводства і агародніны. На аснове гэтага гаспадары павету ўносяць прапанову, каб менавіта ў Сямяцiцкім павеце пабудаваць буйны завод для перапрацоўкі гэтай агародніны і садавіны.

— А каб яшчэ так пчолак развялі! — уздыхнуў правы сфінкс.

— Добра было б, — адказаў яму сфінкс злева. — З яблык было б яблычнае віно, а калі б змяшаць яго з «мёдавіком» — вось напітак!

Пакуль што павятовыя ўлады ў Сямяцічах маюць аднак шмат клопатаў з іншым напіткам, з малаком. Падлічваюць, што гаспадыні ў іх павеце надойваюць у летнія дні звыш 200 тыс. літраў гэтага белага і вельмі карыснага напітку. У той час мясцовыя малачарні могуць перапрацаваць толькі 80 тыс. літраў. Добра было б пабудаваць малочны завод, які б 100—150 тыс. літраў малака ў суткі перарабляў на парашок. Аднак планы ваяводскіх улад ад малочнай прадукцыі неяк не супадаюць з намерамі гаспадароў Сямяцiцкага павету. І таму парашкоўні ў Сямяцічах яшчэ доўга не будзе.

Засумавалі сфінксы княжны Ябланоўскай. Не захацелася ўжо ім слухаць, што ў Сямяцiцкім павеце маюць намер рабіць у іншых галінах сельскай гаспадаркі. А планы там таксама даволі багатыя.

Максім Нурэцкі

Грамадскі суд

На заводзе здарылася такое: трое рабочых, замест працаваць, спалі на складзе сыравіны, былі п'яныя. Калі іх разбудзілі, пачалі ўцякаць, а адзін з іх зняважыў вартаўніка. Гэткая справа з'яўляецца цяжкім парушэннем дысцыпліны працы, а вінаватыя могуць быць дысцыплінарна звольнены з працы.

А што зрабіць, калі гэта здарылася рабочаму ўпершыню, калі ён дагэтуль быў добрым працаўніком?

На Гайнаўскім заводзе сухой дыстыляцыі драўніны створан грамадскі суд. Суд дзейнічае ад 1966 года, а «суддзяў» выбіраюць на справаздачна-выбарным сходзе прафсаюзнай арганізацыі. Разглядае ён усе справы «малога калібру», якія здарыліся на заводзе. Найчасцей справы накіроўвае сюды дырэкцыя завода.

Старшыня грамадскага суда пры «хімічнай» Герард Дурляк расказвае, што за паўтара месяца гэтага года ў суд накіраваны аж чатыры справы: за зняваrу вартаўніка, пераскокванне праз агароджу завода і дзве справы за п'янства.

Возьмем справу п'янства. Справа пачалася так, што прамысловая стража заўважыла п'яных рабочых на тэрыторыі завода. Кіраўнік аддзялення, у якім гэта здарылася, накіраваў рапарт дырэкцыі завода. Дырэкцыя вырашыла справу накіраваць у грамадскі суд. Абапіраючыся на гэта, суд арганізуе «расправу». Выcланы былі паведамленні, а «расправа» адбылася на тэрыторыі аддзялення, дзе выпадак меў месца. У асноўным так і практыкуецца, а на пасяджэнні суда прыходзяць рабочыя калектыву. Пасля таго, як выслухаюцца бакі (абвінавачваючага і абвінавачанага), суд выдае пастанову. У даным выпадку яна гучэла так: а) даць выгавар з упісаннем у персанальныя акты і падаць аб гэтым да ведама ўсяго рабочага калектыву, вывешваючы аб'яву на таблiцы аб'яў і б) уплаціць па 150 зл. на грамадскія справы. Выдаючы такую пастанову, суд кіраваўся іх доўгатэрміновым стажам працы і добрым выкананнем абавязкаў, а таксама фактам, што такое правіненне здарылася ўпершыню.

Людзі вельмі перажываюць, калі знойдуцца перад грамадскім судом. Проста па той прычыне, што судзяць іх сябры па працы, што трэба чырванець перад сваімі людзьмі, што гэта ўсё адбываецца на вачах рабочага калектыву. Тут няма адвакатаў і юрыдычных кручкоў. Адзін з рабочых сказаў мне нават, што калі б яму што-небудзь здарылася, то ён лепш хацеў бы, каб яго справу разглядаў суд у Бельску.

— У нас, — гаварыў ён, — пакаранне можа і меншае, чым у нармальным судзе, але наясіся столькі ўстыду, што на дзесяты раз адхочацца гэта рабіць.

— З дырэкцыяй, калі пакарае, можна ваяваць, — гаварыў іншы рабочы, — а са сваімі сябрамі не навaюеш, бо яны ж такі ж самы хлеб ядуць, як і ўсе.

Здараюцца ў судзе больш складаныя справы. Нядаўна была накіравана ў суд справа, якая пачалася ад звычайных жартаў. Дзяўчына хляпнула вадой ца хлопца, той настолькі хацеў быць сапраўдным мужчынам, што сапхнуў яе са сходаў. Дзяўчына звіхнула руку. Паколькі ўсё гэта адбылося вечарам, і амбулаторыя завода была закрыта, дзяўчыну адвезлі ў хуткую дапамогу, дзе яна атрымала накіраванне на прасвятленне. У суме на некалькі гадзін была спынена праца некалькіх людзей. Хтосьці мусіў іх заступаць, а ўсё гэта з кішэні рабочага калектыву. Інакш гаворачы, рабочы калектыў вымушаны плаціць за непаважныя жарты. Не ведаю, якая будзе пастанова грамадскага суда, але вядома, што разгледзіць ён усё падрабязна і выдасць пастанову, згодную з інтарэсам рабочага калектыву.

На «хімічнай» здараліся і такія выпадкі, калі справу, накіраваную пракурору, аддаваў ён пад разгляд прызаводскому грамадскаму суду. Гэта сведчыць аб вялікай даверанасці грамадскаму суду, які кантралюецца павятовай пракуратурай. Нездарма высока ацаніла яго працу экзекутыва Ваяводскага камітэта ПАРП.

А. Карпюк

Этнаграфічнае вакенца



Вёска Лящукі Гайнаўскага павету. *Фота Я. Цялушэцкага.*

Беларуская літаратура

Нашаніўская пара

«НАША НІВА» Ў АЦЭНКАХ КРЫТЫКАЎ — ЧАСТКА III

Пасля рэвалюцыі першыя рэзка адмоўныя характарыстыкі «Нашай нівы» паявіліся ў 1929 годзе. Крытык Барашка атакаваў не толькі «Нашу ніву», але таксама і пісьменнікаў, звязаных з ёю. Крытык гэты даказваў, што пісьменнікі старэйшага пакалення не могуць быць узорам для маладых беларускіх пісьменнікаў. «Нам ясна, — піcаў Барашка, — клясікі, узгадаваны на нашаніўскай нацыянал-дэмакратычнай ідэалогіі, на ідэях буржуазнага адраджэння, якія з'яўляюцца цяпер правымі савецкімі папутчыкамі ў сучаснай беларускай літаратуры, безумоўна, не могуць быць апекунамі над Гартным, Александровічам, Зарэцкім». (Я. Барашка. Пад сцягам барацьбы за гегемонію пралетарскай літаратуры).

У 1931 годзе Таварыства гісторыкаў-марксістаў склікала спецыяльную нараду, прысвечаную «Нашай ніве». Многія з удзельнікаў нарады падкрэслівалі ўмераны лібералізм, а нават становыя рысы газеты, аднак большасць удзельнікаў рэзка адмоўна ацаніла праграму і характар тыднёвіка. Выключнай рэзкасцю адзначаліся выказванні аб «Нашай ніве» такіх крытыкаў, як А. Кучар, Л. Бэндэ, Я. Браншгэйн. Крытыкі гэтыя даказвалі, што такія беларускія пісьменнікі, як Купала, Колас, Багдановіч, выхаваліся на рэакцыйнай ідэалогіі «Нашай нівы» і што з гэтай прычыны не зразумелі рэвалюцыйнай барацьбы. Вось фрагмент артыкула Кучара і Бэндэ, у якім аўтары характарызуюць сувязь ідэалогіі «Нашай нівы» з творчасцю Я. Купалы: «Аднак ужо ў гэты перыяд знаходзім элементы ідэалізацыі сярэдневяковага мінулага, элементы адрыву нацыянальнага вызвалення ад класавага, элементы высоўвання на першы план нацыянальных інтарэсаў».

У гэтым сказваецца ўжо уплыў буржуазнага нацыяналістычнага асяроддзя «Нашай нівы», у якім знаходзіўся Купала ў той час» (Л. Бэндэ, А. Кучар, Матэрыялы для нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры).

Падобным чынам ацанілі Бэндэ і Кучар сувязі Я. Коласа з «Нашай нівай». Паслухайма крытыкаў: «Якуб Колас як палітычнай дзейнасцю, так і творчасцю, змагаецца пад штандарамі «Нашай нівы» за «адраджэнне Беларусі», за «адраджэнне бацькаўшчыны», з'яўляецца тыпова нацыяналістычнае захапленне адзіным беларускім народам, ідэалізацыя, хоць цёмнага, бруднага, жахлівага і паднявольнага жыцця беларускай вёскі, але «свайго», «роднага», «самабытнага» (там жа).

У 1936 годзе крытык Браншгэйн у артыкуле, прысвечаным трыццатай гадавіне творчасці Коласа, напісаў, што Колас, знаходзячыся ў няволі буржуазна-ліберальных ідэалаў «Нашай нівы», трактаваў барацьбу за нацыянальнае вызваленне народаў як шавіністычную барацьбу паміж народамі.

Пасля другой сусветнай вайны паявіліся працы, аўтары якіх выступілі супраць адмоўнай трактоўкі ролі «Нашай нівы» ў беларускай літаратуры. Прыкладам такой працы можа быць артыкул Смолькіна, у якім аўтар напісаў: «У гэтай ацэнцы сказаўся нігілістычны падыход, змешванне прагрэсіўнай ролі нацыянальнага руху сярод прыгнечанай беларускай нацыі ва ўмовах царскага самадзяржаўя з безумоўна рэакцыйнай дзейнасцю нацыяналістаў ва ўмовах савецкага ладу...

Цэнтрам, вакол якога групавалася беларуская інтэлігенцыя, зрабілася газета «Наша ніва». У ёй знайшла сваё ўяўленне палітычная праграма руху, тут стваралася новая беларуская літаратура, развівалася беларуская літаратурная мова... Для чэсці «Нашай нівы» трэба зазначыць, што нацыяналістычныя настроі ніколі не прымалі тут крайняй усеабдымнай формы». (М. Смолькін, «Наша ніва» і беларуская літаратура»).

У 1949 годзе пачынаецца новы перыяд рэзка адмоўных адносін да «Нашай нівы». Пры гэтым аднак перамяніліся рэзка адносіны крытыкі да творчасці Коласа, Купалы, Багдановіча, Цёткі ў перыяд «Нашай нівы». Творчасць пісьменнікаў акрэслівалі крытыкі як з'яву паслядоўна дэмакратычную. Тэзіс аб дэмакратызме творчасці пісьменнікаў пярэчыў тэзісу аб рэакцыйнасці «Нашай нівы», якая, як вядома, апублікавала большасць твораў гэтых пісьменнікаў. Крытыкі знайшлі выхад з гэтага становішча. Пачалі даказваць, што беларускія пісьменнікі адносіліся адмоўна да праграмы «Нашай нівы», аднак друкавалі ў ёй свае творы, бо ў той час не было іншай беларускай газеты.

Такая трактоўка пытання знайшла найпаўнейшае выяўленне ў працы Фіглоўскай. «У сувязі з тым, — піша Фіглоўская, — што гэта газета была адзіным перыядычным выданнем у Беларусі, на яе старонках вымушаны былі друкавацца прадстаўнікі розных класаў, розных поглядаў, перакананняў. З аднаго боку тут змяшчалі свае творы буржуазныя нацыяналісты, а з другога — прагрэсіўныя рэвалюцыйна-дэмакратычныя пісьменнікі і публіцысты. Паміж імі адбывалася абвостраная ідэйная барацьба, якая з'явілася адлюстраваннем барацьбы процістаячых напрамкаў у беларускай мастацкай літаратуры, барацьба дзвюх культур у беларускай нацыянальнай культуры: рэвалюцыйна-дэмакратычнай і буржуазна-дэмакратычнай» (Л. Фіглоўская, Творчасць Я. Коласа).

Такім чынам, Фіглоўская не толькі раздзяліла, але і супрацьставіла пісьменнікаў праграме іх органа «Наша ніва».



Прадпрыемства «Лес»

Пры шашы ў Валілах знаходзіцца свайго роду фабрыка, якая мае афіцыйную назву Прадпрыемства лясной прадукцыі «Лес». Працуе тут 77 чалавек. Увайшоўшы за браму прадпрыемства, перш за ўсё бачым высокія лашты рознага памеру скрынак, а далей будынак з дымячым комінам. Тут жа за брамаю знаходзіцца даволі цеснае памяшканне, у якім змяшчаецца кантора прадпрыемства. У ёй знаёмімся мы з кіраўніком Рыгорам Іванюком і працаўніком Кастусём Субетам. Ад іх даведваемся, што зімою яны прадукуюць у асноўным «тару» для розных прадпрыемстваў Беластока і Беласточчыны. Без належнай упакоўкі тавару, вядома, нікуды яго не павязеш, і таму паслугі прадпрыемства «Лес» вельмі важныя для іншых прадпрыемстваў. Месячная прадукцыя дасягае часам мільёна злотых.


Апрача скрынак, плятуць тут зімою таксама кошыкі на заказ. Частку кошыкаў высылаюць на экспарт.

А вось летам і восенню прадпрыемства скупляе ягады, грыбы, зёлы і кару. У мінулым годзе чорных ягад было скуплена больш як 20 тон, лісічак (курак свежых) 118 тон, зялёнак — 9 тон, апенек — 7 тон. Асабліва многа ўвагі патрабуюць куркі. Яе тутэйшыя рабочыя сартавалі ноччу і адпраўлялі на экспарт. Удзень, калі цёпла, яны парацца. Зялёнкі на месцы працаўнікі прадпрыемства засольвалі ў бочкі і адпраўлялі цягнікам да месца прызначэння. 60% прадукцыі прадпрыемства высылаецца на экспарт. У сваім раёне прадпрыемства мае 27 пунктаў скупкі ягад і грыбоў. Да найлепшых залічаюцца пункты скупкі ў Валілах, Саколі і Скрабляках. Жыхары лясных вёсак збіраннем ягад і грыбоў штогод значна ўзмацняюць свой сямейны бюджэт.

За 1 кг апенек прадпрыемства плаціла ў мінулым годзе 6 зл, за 1 кг зялёнак — 7 зл, а за куркі і чорныя ягады — па 15 зл. за кг.

Людзі прадпрыемства — гэта мясцовыя жыхары Валіл, Гарадка і навакольных вёсак. Некаторыя з іх ужо працуюць шмат гадоў. Вось, напрыклад, Вера Чамель, Юзэфа Шышка і Галена Рошка працуюць тут ужо па 11 год.

(мх)



Песні, мае песні, дзе я вас падзену?
Забяру ў фартушок, па полю рассею!
Як мне будзе добра, то вас пазбіраю,
А як будзе кепско, то пазабываю.
Як на маём полі пшаніца радзіла,
То тады да мене радзіна хадзіла.
Як на маём полі куколь зарадзіўся,
То тады пра мэне родны брат забыўся.
Пяць гадоў праходзіт, а брат не прыходзіт,
Ідзе годзік шосты — едзе брат до сёстры.
На парог ступае, доленькі пытае:
— Ой, сястра, сястронка, чы жыва-здарова?
Чы жыва-здарова, чы добрая доля?
— Я такое долі ні жычу нікому,
А шчэ табе, брату, брату маладому!
Была ў мэне коса, коса да паёса —
Як зачаў муж біці — вырваў да валоса.
Куколю, куколю, ні расці на полю,
Расці на балоці — ні трэбо палоці!
Расці на балоці — ні трэбо палоці!

Ад Валянціны Саевіч, 1928 г. нараджэння, вёска Старое Ляўкова Гайнаўскага павету, запісаў 30 жніўня 1972 г. Мікалай Гайдук. З магнетафоннай стужкі нотны запіс зрабіў Эдуард Гойлік.

У прыклад другім

Селянін вёскі Новае Ляўкова Гайнаўскага павету, Міхась Баканач з'яўляецца адным з лепшых гаспадароў у сваёй акрузе. Калі ліквідавалі абавязковыя пастаўкі збожжа, бульбы і мяса, а за ўсё можна было заплаціць грашыма, Міхась Баканач адразу ж заняўся жывёлагадоўляй. Пашы ў яго было даволі шмат. Завёў ён кароў. Пабудаваў мураваны беспадсцілачны каровнік, у якім механізаваў усе працы. Абора атрымалася відная, чыстая і даволі прасторная. Міхась Баканач, паколькі адначасова з'яўляецца добрым столярам і мае ўласнае сталярскае прадпрыемства, адпаведна абсталяваў загарадкі, калідорчык. Неабходна было заняцца сіласам. Пабудаваў ён яго ўжо паводле навейшых узораў, так, каб не было дадатковых клопатаў з перавозкай кішонкі да аборы. Зялёнае жыта сіласаваў упершыню і таму папрасіў дапамогі ў агранома Мікалая Харкевіча. Атрымалася ўсё добра. На зіму апрача сена, такім чынам, было падрыхтавана каля 20 тон кішонак. Каровы спачатку неахвотна елі кішонку, а зараз дык так і чакаюць, калі яе пададуць. Колькасць малака значна павялічылася. Міхась Баканач штодзень возіць яго ў малачарню па 20 і больш літраў, а летам больш 30 літраў. Каб не чакаць, пакуль з цялят вырастуць дойныя каровы, ён купіў адну і намераны купіць яшчэ другую. Новая карова таксама засмакавала ў кішонцы і пачала даваць куды больш малака, чымсьці ў свайго папярэдняга гаспадара.

Глядзелі ў Міхася Баканача сілас аднавяскоўцы. Двое з іх за прыкладам М. Баканача пабудавалі сіласы ў сябе і хваляць іх. Як, напрыклад, Ільяш Пучынскі і Мікалай Сахарчук. Міхась Баканач ахвотна раіць суседзям, каб тыя пабудавалі сіласныя ямы ў сябе, падае прыклады, як лепш будаваць, але тыя ківаюць галовамі, маўляў, навошта тут штодзень «пэцкацца». І з году ў год сыплюць у свае сіласы бульбу ды агародніну. А аднак варта было б ім прызадумацца над тым і выкарыстоўваць сіласы згодна з прызначэннем. Навошта крыўдзіць кароў, засушваць іх. Да сена, сечкі ці збожжавых плеваў добра было б дадаць свежай ды сочнай пашы — кішонкі.

(ця)

Чытайце і распаўсюджвайце «Ніву»!

У Геранімове — змены на лепшае



Тут знаходзіцца бюро сельскагаспадарчага прадпрыемства ў Геранімове.

Нядаўна ПГР у Геранімове Беластоцкага павету быў далучаны да шматаб'ектавай сельска-агародніннай гаспадаркі ў Ігнатках, якая аб'ядноўвае ПГР-ы: Валілы, Геранімова, Дабжынева і мяшальню пашаў у Суражы. З-за гэтага ўведзены таксама пэўныя змены нават у прадукцыі.

Пачнем аднак ад парка сельскагаспадарчых машын сельскагаспадарчага прадукцыйнага прадпрыемства ў Геранімове. Мае яно, між іншым, 27 трактараў з камплектамі падвесных машын, 6 камбайнаў «Вістуля» і іншыя.

На 1 202 гектары усіх зямельных угоддзяў збожжавыя культуры займаюць 66%. Вырошчваецца тут высокапрадукцыйны сорт жыта «данькоўскае залатое», новы сорт жыта «тэтра Гожуў» (больш высокаплённы, чымсьці звычайнае жыта і дае многа зялёнай масы, таму вялікая яго прыдатнасць на азімыя), з пшаніцы вырошчваецца тут «данькоўская белая», інтэнсіўны сорт ячменю «дамазы» і высокаплённы сорт «флемінгвайс». У мінулым годзе ўраджай збожжавых культур быў даволі высокі — больш 30 цэнтнераў з гектара. Найлепш урадзіў авёс — каля 37 цэнтнераў з 1 га.

Мінулы год рабочы калектыў геранімоўскага сельскагаспадарчага прадпрыемства закончыў даходам у 623 тысячы злотых. Сяляне з навакольных вёсак, а нават з ПГР Дабжынева куплялі тут кішонкі, сена і салому. На павелічэнне кармоў мела вялікі ўплыў меліярацыя і загаспадарванне лугоў і пасбішчаў, а таксама дрэнаж 350 гектараў палёў. Цяпер можна раней пачынаць палявыя работы. Многа аднак тут каменняў. З-за іх часта псуюцца сельскагаспадарчыя машыны. А ўжо перш за ўсё пры касьбе. Толькі ў 1971 годзе на збіранне камення выдаткавана 4,5 мільёнаў злотых. І так штогод ад пачатку існавання ПГР, г. зн. ад 1955 года.

Зямельных угоддзяў сельскагаспадарчаму прадпрыемству ў Геранімове прыбывае. Моладзь у навакольных вёсках масава пераходзіць у горад, расце банк зямельных угоддзяў ПФЗ. Прадпрыемству загаспадарыць іх будзе пад сілу.


Прадпрыемства, апрача прадукцыі пасяўнога зерня, пачало вырошчваць вельмі добрыя сарты саджанцаў бульбы. У мінулым годзе атрымалі 950 тон бульбы. Узнікла думка, каб заняцца жывёлагадоўляй у шырокім маштабе. Добрых тарфяных лугоў і пасбішчаў ёсць удосталь. Сена шмат. Кожны гектар дае ўраджай сена ў 45 цэнтнераў, а здаралася, што нават 70 цэнтнераў. Правільнага загаспадарання дачакаліся пасбішчы. Шкада аднак, што дагэтуль не павялічана пагалоўе кароў. Найбольш было іх 450—500 штук. ПГР-аўцы гадавалі таксама да 30 свінаматак. Рэзервы ў гэтай галіне нявыкарыстаны. Колькасць кароў можна прынамсі падвоіць. Адной з прычын слабога тэмпа развіцця гадоўлі быў недахоп інвентарскіх будынкаў. Тры панскія аборы замалыя. Іх неабходна мадэрнізаваць. Апрача таго, будуць пабудаваны новыя аборы, склады на фруктовыя плады, на сродкі аховы пладовых дрэў.

— У сувязі з далучэннем нашага сельскагаспадарчага прадпрыемства ў Геранімове да вялікага прадпрыемства ў Ігнатках, — гаворыць дырэктар Генрык Абрамовіч, — зараз у Геранімове мы перарабляем свінярню на цялятнік, пакінем гадоўлю малочнага быдла, пачнем гадаваць больш тысячы букатаў і нават на экспарт. Намер гэты пастараемся ажыццявіць ужо ў 1974 годзе. Дзвесце гектараў адвядзем пад сад і больш дзесяці пад агародніну. У інвентарскіх будынках увядзем поўную механізацыю ўсіх работ. Аборы будуць беспадсцілачныя. З думкай аб хуткім рамонце сваіх сельскагаспадарчых машын і механізацыі абораў мы арганізавалі рамонтны цэх. Толькі капітальныя рамонты мы выконваем у Юхноўцы. Атрымалі мы фінансавыя сродкі на куплю сеткі, якой абгародзім сад. Пабудуем таксама новыя жылыя дамы для нашых рабочых сем'яў. Падумаем аб клубе.

— Якіх паспяховых вынікаў дабіліся мы ў сельскай прадукцыі?

— Дзяржаве прадалі ў студзені гэтага года 85 тыс. кілаграмаў ялавічыны, 5 тыс. кілаграмаў свініны, 270 парасят, сотні тон пасяўнога зерня і пасяўнагатунковых саджанцаў бульбы і 142 тоны саломы. Зараз дасягнулі прырост вагі кожнай штукі быдла ў 800 грамаў у суткі. У нашых умовах гэта добры вынік.

Тэкст і фота Янкі Цялушэцкага.



Адна з навейшых абораў.

З БЕЛАРУСКАГА СПОРТУ



Гэта фраза можа здацца перабольшаннем, бо гутарка ідзе аб краіне, чыя спартыўная слава і традыцыі грунтуюцца на футболе і боксе. **І ўсё ж** Корбут заваявала на Брытанскіх астравах усе трафеі, якімі толькі могуць узнагародзіць свайго героя сэрцы спартыўных балельшчыкаў.

Гледачы брытанскага тэлебачання пераважнай колькасцю галасоў назвалі 17-гадовую гімнастку з Гродна самай яркай «спартыўнай індывідуальнасцю года». Вядучы спартыўны каментатар Бі-Бі-Сі А. Уікс зрабіў падарожжа ў Грузію, дзе адпачывала Вольга, каб уручыць ёй прыз — сярэбраную мадэль тэлевізійнай камеры. Рэпартаж аб гэтай падзеі быў уключаны ў першую праграму Бі-Бі-Сі.


Спартыўныя журналісты, якія ўдзельнічалі ў праведзеным часопісам «Уорлд Спортс» апытанні, назвалі Корбут «лепшай спартсменкай года». Вольга зноў апынулася практычна па-за канкурэнцыяй. «Яна была на мілю наперадзе за іншых прэтэндэнтак», — заявіў мне адзін з супрацоўнікаў часопіса.

І яшчэ адно сведчанне. Нядзельная газета са шматмільённым тыражом «Сандзі піпл», як і Бі-Бі-Сі, запрасіла сваіх чытачоў адказаць на пытанне: хто ў 1972 годзе быў «спартыўнай індывідуальнасцю нумар адзін?» Э. Сайкс, адзін з кіраўнікоў рэдакцыі, гаворыць: «Вольга Корбут атрымала пераважную колькасцю галасоў. Ніколі яшчэ за маю практыку я не назіраў такога малюнка».

Цікава, што на нязвыклым для яго другім месцы апынуўся Марк Спіц, які нязменна першынстваваў на водных дарожках XX Алімпіяды ў Мюнхене і заваяваў там сем залатых медалёў. Паводле слоў газеты, Вольга нанесла яму «сакрушальнае паражэнне».

Вольга Корбут, як вядома, на алімпіядзе не стала абсалютнай чэмпіёнкай, і ўсё ж яе выступленне зрабіла найбольшае ўражанне. Папулярнасць Корбут выклікана не толькі дасканаласцю яе майстэрства, але і яе асабістай абаяльнасцю.

Мяркуючы па адказах, атрыманых Бі-Бі-Сі і «Сандзі піпл», уласна спартыўныя балельшчыкі склалі толькі невялікую долю прыхільнікаў таленту Вольгі. Пра яе з захапленнем гавораць людзі, якія нават ніколі не былі на стадыёне, не тое што ў гімнастычнай зале.



Вось словы англійскіх гледачоў, якія дапамагаюць зразумець прычыны велізарнага поспеху ў іх Вольгі:

— У ёй з незвычайнай яркасцю ўвасобілася сама маладосць, сама радасць у яе чыстым выглядзе.

— Гэта — фенамен! Такая свежасць і непасрэднасць перажыванняў!..

— Вольга прымушае кожнага дарослага паверыць, што яна — яго ўласная дачка.

«Сандзі піпл» піша: «Вольга ператварыла спорт у мастацтва і кожны мог гэта бачыць сваімі вачыма».

Мільёны англічан перажывалі за яе.

— Я ведаю людзей, — гаварыла мне знаёмая англічанка, — якія плакалі перад экранам тэлевізара, калі Корбут у час Алімпіяды сарвалася на брусах.

Я таксама глядзеў гэтыя кадры і да гэтага часу памятаю вокліч англійскага тэлекаментатара, у якім адчуваўся непадробны адчай...

Каментатар тэлевізійнай кампаніі Ай-Ці-Ві Хіл гаворыць: «Яе постаць, асоба, яе майстэрства захапілі спартыўны свет у 1972 годзе, і я, як і мільёны іншых, закахаўся ў Корбут — чарцяня і чарадзейку». Паводле сцвярджэння Хіла, беларуская гімнастка парадзіла своеасаблівы культ сярод англійскіх дзяўчат, якія ва ўсім хочуць быць падобнымі на Вольгу.

В. Васілец
кар. ТАСС

(Працяг са стар. 3)

ПЛЁН БЕЛАВЕЖСКАЙ ГЛЕБЫ

порах і ў іншых паэтычных парахаўніцах старой гвардыі белавежцаў.

Зрэшты, маем ужо маладое пакаленне літаратараў. На старонках «Нівы» ўсё часцей друкуюцца новыя людзі — Зося Сачко, Надзея Артымовіч, Янка Кірызюк, Ірэна Баравік, Ніна Гаўрылюк і іншыя, наглядаюцца новыя з'явы ў літаратурным руху, пішуць па-беларуску не толькі вучні беларускіх ліцэяў, але таксама і польскіх, змяшчаюцца вершы на мясцовым дыялекце. Новыя таленты, моладзь — гэта наша найбольшая надзея, і, веру, прыйдзе час, калі і яны атрымаюць сваё афармленне ў нейкім асобным зборніку.

Ада Чэчуга

*) Літаратурная Беласточчына. Выдавецтва «Мастацкая літаратура». Мінск 1973.



КАБ У ХАЦЕ БЫЛО ПРЫГОЖА

Як рабіць, каб у хаце былі не толькі ўсе выгоды, але каб было ўтульна і прыгожа?!

Часта яшчэ нашыя вясковыя гаспадыні не зусім правільна разумеюць гэту справу. Хочучы, як кажуць, «на гвалт» зрабіць кватэру ўтульнай, купляюць яны ў вандроўных саматужнікаў-гандляроў розныя малявідлы, якімі завешваюць сцены, а яны пасля не толькі ствараюць уют, колькі адстрашваюць чалавека. Больш таго, вясковыя бабы даюць нават вялікія кавалкі матэрыялу, на якім такі вандроўны мастак хляпае некалькі кветак, і гэтымі капамі засцілаюць яны свае ложкі. А як іх будуць пасля праць? Праўда, у вёсцы — не ў горадзе, столькі пылу няма, але ўсё ж кожная рэч патрабуе, каб яе ад часу да часу асвяжылі.

Прыгожае не толькі тое, што каляровае, стракатае. Можа быць звычайная саламяная мата, але калі яна павешана на месцы і гарманізуе з цэласцю, дык з'яўляецца, не гаворачы ўжо аб карысці, вельмі прыгожым дэкарацыйным элементам.

Часта, напрыклад, у некаторых вясковых хатах можна ўбачыць такі куточак: стаіць ложак, накрыты вельмі стракатай капай, над ім вісіць каляровая макатка (алені і лебедзі вядуць тут прым), каля ложка пад нагамі ляжыць дыванік у розныя ўзоры. Побач стаіць стол, накрыты нейлонавым абрусом у кветкі, а на стале стаіць ваза з штучнымі кветкамі. Усё гэта разам не стварае гармоніі, а наадварот, вельмі «грызецца». І цяжка было б залічыць такую кватэру да добра абсталяванай, хаця мэбля можа ў ёй быць дарагая і добрая.

Ці ж не лепей выглядаў бы гэты пакой, каб, скажам, капа на ложку была ў нейкія стракатыя ўзоры альбо ў клетку (вельмі прыгожыя і не надта дарагія ёсць у «Цэпэліі»), а побач на сцяне вісела мата з саломы! На падлозе можна было б палажыць гладкую, аднаго колеру дарожку, стол засцлаць густоўным льняным абрусом, у гліняны збанок цяпер, вясною, уставіць некалькі галінак, наліць вады — няхай выпускаюць зялёныя лісточкі, і паставіць збанок на стале.

Такое ўпрыгожанне пакою напэўна не каштавала б больш, і ўсё, што мы тут запрапанавалі, ёсць у нашых магазінах. Шкада толькі, што на вёсцы людзі часта недаацэньваюць вырабаў мясцовага паходжання. Лепш купляюць нейкую мазню на кірмашы, чым прыгожы лён ці саламяную макатку. А трэба ведаць, што ўсюды за мяжой, асабліва на захадзе, усе гэтыя нашы вырабы вельмі цэняцца. Яны ж самабытныя, непаўторныя і прыгожыя.

Гаспадыня



Дзень работы даў цудоўныя вынікі. Да прыцемку прадукты харчавання схавалі ў воданепранікальнае схоўішча, выкапалі ладную зямлянку, у якой маглі адначасова спаць два чалавекі; рацыю паставілі пад павець з ільнянога палатна ад парашутаў. Каб яны вось гэтак папрацавалі яшчэ які тыдзень, заўважыў Вайтхазе, іхні лагер стаў бы, як цацачка, у ім было б амаль гэтак жа ўтульна жыць, як і ў самай шыкоўнай кватэры.

Той ноччу яны дарэмна чакалі прыходу Франке. Пасля паўночы Будэр перадаў па радыё, што месца выкідкі грузу будзе паведамлена наступнай ноччу. Аднак мінулі суткі, і Будэру зноў давялося радзіраваць свайму карэспандэнту, што аперацыя адкладаецца, таму што Франке яшчэ не вярнуўся з задання.

Альтэнкірх пачаў непакоіцца. Ён баяўся, што Франке схапілі — данясенне трапіла ў рукі ворага, а Франке выдаў месцазнаходжанне іхняга лагера, і з хвіліны на хвіліну можна чакаць прыходу рускіх. Ён настойваў на тым, каб пакінуць лагер, — узяць з сабою толькі рацыю і адысці ў глыб лесу на некалькі кіламетраў.

— А што будзе, калі Франке ўсё ж вернецца? — запярэчыў Вайтхазе. — Як ён нас знойдзе? З такой тактыкай партызанскую вайну весці нельга.

Нарэшце, у перадранішняй шэрані ў хмызняку паказаўся Франке. Ён ледзь трымаўся на нагах, і здавалася, вось-вось сілы пакінуць яго. Аж да самага пояса ён быў запэцканы граззю і ціпай, у дыску яго аўтамата засталося некалькі апошніх патронаў. Франке расказаў, што калі ён прабіраўся праз прагаліну, яго высачыў рускі ваенны патруль і пачаў страляць і праследаваць яго. За ім гналіся цэлы дзень, а потым паявіліся коннікі, але, нарэшце, яму ўдалося заблытаць сляды і выратавацца.

—Дваіх я збіў з сядла, — сказаў ён, але ў голасе яго не было вялікай радасці.

— А што з данясеннем? — запытаў Альтэнкірх.

Толькі тут Франке ўспомніў пра сваё заданне. Ён з'явіўся да падпалкоўніка, і той не помніў сябе ад радасці. Перадаў парашутыстам сваю падзяку і прывітанне. Франке выцягнуў з кішэні паперу — план мясцовасці, на якім быў паказаны квадрат, куды патрэбна скінуць груз.

— Падрыхтаваны ўжо сігнальныя вогнішчы, — паясніў Франке. — Іх запаляць, як толькі пачуюць гул самалётаў. Падпалкоўнік Грэльхамер загадаў неадкладна скласці і перадаць радыёграму.

— З даручэннем вы справіліся выдатна, — пахваліў Вайтхазе.

— Гэта яшчэ не ўсё, — сказаў Франке. — Грэльхамер загадаў перанесці рацыю на пятнаццаць кіламетраў на поўнач. Вось у гэты лес. — Ён выняў з гімнасцёркі яшчэ адну схему. Малюнак амаль зусім сцёрся, але можна яшчэ было разгледзець на ёй праведзеныя алоўкам лініі. З дапамогай карты вызначылі лес, куды трэба перабазіравацца.

Паслалі яшчэ адну радыёграму. Указалі каардынаты месца, дзе павінны былі скідаць прадукты і боепрыпасы, і зноў падкрэслілі вартасць таго, каб як найхутчэй у вялікай колькасці было прыслана ўсё, аб чым прасілі. Потым ускінулі на плечы свае ношы і пакрочылі на поўнач. Франке з Будэрам пагрузілі на сябе рацыю і батарэі. Мартынаў і абодва афіцэры неслі кожны па паўцэнтнеру прадуктаў і амуніцыі.

Наперадзе ішоў Альтэнкірх. На жываце яго матлялася планшэтка, на грудзях гойдаўся компас. Ён добра запомніў маршрут і першы час толькі зрэдку асвятляў на імгненне карту прытушаным святлом кішэннага ліхтарыка. Ні на адзін міг ён не мог дазволіць сабе падумаць пра нешта іншае — адзін раз давялося зрабіць вялікі круг, каб абысці непралазны гушчар, а потым лічыць крокі, каб зноў выйсці на правільны курс; у другі раз, калі яны ішлі па зарослай высокай травой раўніне, ён занадта далёка збочыў улева і з вялікаю цяжкасцю зноў зарыентаваўся на мясцовасці.

Пайшоў дождж. Трава на лясных палянах і на лугах прасякнулася вадой, і неўзабаве боты і штаны падарожнікаў прамоклі наскрозь. Франке хацеў нацягнуць на галаву плашч-палатку, але Вайтхазе забараніў яму рабіць гэта: так дрэнна чуць. Франке вылаяўся са злосці. Пачалі лаяцца і астатнія. Калі, сагнуўшыся пад цяжарам, яны апынуліся ва ўтульным на выгляд кутку, іх раптам апанавала жаданне скінуць свае ношы, залезці пад які куст, укрыцца ў плашч-палатку і заваліцца спаць. Яны разумелі, што, каб хтось з іх раптам прапанаваў зрабіць прывал, яны б у тую ноч больш ні на крок не пасунуліся наперад. Але Вайтхазе сказаў:

— Засталося адолець апошнія сем кіламетраў.

Неўзабаве яны забрылі ў багну, і, перш чым схапіліся, Альтэнкірх увязнуў па самыя калені. Яго выцягнулі і, асцярожна ступаючы, падаліся назад, пакуль не адчулі пад нагамі цвёрдую глебу.

(Працяг будзе)

ТРЫБУНА чытачоў

ДЗІЎНА

Нядаўна ў Дубічах Царкоўных збіралі складчыну на грамадскі фонд будовы школ і інтэрнатаў. Людзі плацілі. Яны ведаюць і разумеюць, што гэта мерапрыемства патрэбнае. Чым больш набудуем школ і інтэрнатаў, тым лепш будзе нашым дзецям.

На жаль, не ўсе гэта зразумелі. І дзіўна, найбольш «ашчаднымі» былі тыя бацькі, дзеці якіх вучацца ў розных школах, а інтэрнат — іх дом.

М. Панфілюк

У КАГО ЁСЦЬ ГЭТЫЯ КНІЖКІ?

Маё хобі — кніжкі. Некаторых не магу здабыць. А вось яны (куплю за залічэннем паштовым):

1. Dołęga Mostowicz „Profesor Wilczur", „Znachor";
2. Michał Zewaco „Intryga" t. II;
3. J. Farnda „Sygnet sir Ryszarda";
4. W. Osiejewa „Wasiek Trubaczow i jego koledzy";
5. E. Paukszty „Srebrna ławica";
6. St. Fleszer Muskat „Przerwa na życie";
8. J. Dobraczyński „A znak nie będzie mu dany" t. II.

Калі ў каго ёсць гэтыя кніжкі, прашу пісаць на адрас:
Tatiana Rzepko, 17250, Kleszczele, ul. Dobrowodzka 49.

Кансультацыя ЮРЫСТА

ПЫТАННЕ: Присуджаныя судом на дзіця аліменты могуць быць зменены. Ці маці дзіцяці можа падаваць у суд наконт павышэння аліментаў, калі ўздумае, ці толькі пасля пэўнага часу ад папярэдняга рашэння суда? Прыкладам, у 1972 годзе аліменты былі павышаны з 300 да 500 зл. Ці можа маці дзіцяці патрабаваць іх павышэння ў 1973 годзе?

АДКАЗ: У асноўным, калі суд вырашыў справу, нельга нанава ўносіць позву ў той самай справе. Аднак закон прадбачыць выключэнне, між іншым, у адносінах да аліментаў. У такіх справах у выпадку змены адносін можна патрабаваць змены рашэння суда. У справах аліментацыйных змена адносін разумеецца ў асноўным як павелічэнне, або змяншэнне заробкаў або даходаў бацькі і маці, або павелічэнне ці змяншэнне патрэб дзіцяці. Змены гэтыя павінны быць адчувальнымі. Прыкладам, у меру падрастання дзіцяці — яго патрэбы растуць. Аднак нельга прыняць, што патрэбы 10-гадовага дзіцяці розняцца адчувальна ад патрэб 8-гадовага, хіба што маем дачыненне з надзвычайнымі здарэннямі, як доўгатэрміновая хвароба і каштоўнае лячэнне. Таксама ўзрост або зніжэнне заробкаў ці даходаў павінна быць значнае, каб абгрунтаваць патрабаванне змены велічыні аліментаў.

Таму, калі аліменты былі павышаны ў 1972 г. то толькі незвычайныя здарэнні або значныя змены ў матэрыяльным палажэнні бацькі або маці маглі б абасноўваць новае патрабаванне павышэння аліментаў.



ПАРТЫЗАНЫ

Даспявала ў полі жыта,
Налівались каласы,
На маю старонку скрыта
Наляцелі «штукасы».

Вораг край увесь разбурыў,
Не забыць той барацьбы.
Закрылася сонца хмурай,
Зашумелі ўсе дубы.

Партызаны, партызаны,
Хатай лес быў доўга вам.
Партызаны і салдаты
Прынеслі свабоду нам.

Зазвінелі песні ўзлёты
На паляне пад вярбой,
Слаўнай польскай песні «Роты»
І «Туманы над ракой».

Свеціць сонца над старонкай,
Залівае бляскам свет.
Прывітаем песняй звонкай
Змагароў мінулых лет.

Аляксандр Кавальскі,
вучань I а класа беларускага ліцэя ў Бельску

ГМІННЫ АГЛЯД

11.II. 1973 г. у бібліятэцы ў Грэдалях адбыўся гмінны агляд конкурсу «Усё ведаю аб Краіне Саветаў». Прымалі ўдзел пераможцы мясцовых аглядаў. 14 асоб. Аднолькавую колькасць пунктаў атрымалі Галіна Бурыла са станцыі Грыгораўцы і Валя Васілюк з Алекшаў.

У багатай мастацкай часткі выступіў дзіцячы калектыў. Дарыя Ігнацюк, вучаніца VI класа, прыгожа чытала вершы пра лётчыка. Прыгожа выканалі таксама песні салісткі Людміла Брэнька і Галіна Бурыла і дуэт Раіса Кабрынец і Людміла Андрэюк.

Старэйшае пакаленне таксама прадставіла свае ўмеласці. Група жанчын з гуртка КГВ з Тапчыкалаў выканала савецкія песні. Акампаніраваў на акардэоне Анатоль Брэнька.

Наглядальнік

ці ведаеце, што...

...да 1990 года (у параўнанні з 1970 годам) плануецца на Беласточчыне павялічыць прамысловую вытворчасць амаль у сем разоў (у краіне ў 4—5 разоў) і падвоіць сельскагаспадарчую вытворчасць (у краіне павялічыцца яна на 75 працэнтаў).



Дарагое «Сэрцайка»!

Мне 21 год. Сама я з вёскі, але працую ў горадзе. У нашай вёсцы мала моладзі. Большасць маіх сябровак ужо выйшла замуж, ну, і можна сказаць, што і мне пара выходзіць, не такая ж я маладзенькая. Але выйсці замуж, то бадай ужо і не такая праблема, асабліва, калі маеш адпаведнага кандыдата на мужа. Нядаўна я пазнаёмілася з хлопцам, які мне вельмі спадабаўся. Прыстойны гэта хлапец, разумны, культурны — Уладэк ён завецца. Спатыкаемся мы з ім у горадзе, ходзім у кіно, былі і на вечарынах. Пры спатканні ён часта гаворыць, што мяне кахае і хацеў бы са мной ажаніцца. Ён за мяне на пяць гадоў старэйшы, гаворыць, што пара ўжо яму жаніцца. Але ў гэтым годзе атрымае спулдзельчую кватэру і тады будзе жаніцца, бо цяпер няма дзе падзецца, кожнае з нас жыве на прыватнай кватэры. Я з ім згодна, чакаць жа не так і доўга. Мелі мы ехаць да маіх бацькоў, пагаварыць аб вясельных справах. Але аднойчы я была са сваім хлопцам на забаве. Прыемна мы гулялі, але калі мой хлопец выйшаў на хвіліну з залы, да мяне падышоў знаёмы хлопец і сказаў пад сакрэтам, што Уладэк мае дзяўчыну, што неўзабаве з ёю будзе жаніцца. Мне стала вельмі крыўдна. Не спадзявалася, што можа ён мяне ашукоўваць. Хутка Уладэк вярнуўся, але мой настрой ужо сапсаваўся. Ледзь дачакалася канца забавы. З забавы Уладэк правёў мяне на кватэру. Ідучы, пытаў, чаму я такая сумная, што здарылася, мо хто пакрыўдзіў. І тут я не вытрымала і сказала, што чула аб ім на забаве. Ён толькі засмяўся, махнуў на гэта ўсё рукой і так мы рассталіся. Цяпер я не ведаю, што рабіць і каму верыць, парай, «Сэрцайка».

Бася з Сакольшчыны.

Бася! Згаджаюся з табой, што выйсці замуж не праблема, калі маеш адпаведнага кандыдата на мужа. Аднак спяшацца не раю. Трэба добра хлопца пазнаць, пакуль згодзішся стаць яго жонкай. Закаханай дзяўчыне хлапец здаецца ідэалам, бо каханне, як заслона, хавае за сабой яго дрэнныя бакі. Паводле лісту, хлапец твой сапраўды разумна думае. Матэрыяльныя ўмовы таксама маюць вялікі ўплыў на сямейнае жыццё. Тое, што сказаў табе знаёмы хлапец на забаве, не абавязкова мусіць быць праўдзівае. Мо гэта праз зайздрасць, мо ты яму спадабалася. А гэта найлепшы спосаб, каб пасварыць дзяўчыну з хлопцам. Твой хлапец, відаць, патрактаваў гэта як сапраўдную плётку, калі ўсміхнуўся ды рукой махнуў на гэта. А як сапраўды ёсць — час пакажа. Ды не спяшайся, пачакай, а ўсё выясніцца.

«Сэрцайка»

ПРАЧНУЎСЯ СЕЛЬГАСГУРТОК

У Слоі (Сакольскі павет) ужо тры гады існуе сельгасгурток, у якім было 20 членаў. Але гурток не праяўляў ніякай дзейнасці. У 1972 г. прапанавана яму злучыцца з гуртком у Слойцы, але яго члены не згаджаліся аб'яднаўвацца са Слойкамі. Урэшце 18.II.1973 года сляянцы прынялі рашэнне аб далучэнні. На сходзе прысутнічала 12 новых членаў, і цяпер гурток у Слоі налічвае 32 чалавекі. Сход вырашыў правесці комплекснае апырскванне бульбы і яравога збожжа, сеяць сеўнікам.

Гурток у Слойцы мае 6 трактараў з поўным камплектам машын, а навесну атрымае два камбайны. Апрацоўвае ён 200 гектараў зямлі дзяржаўнага зямельнага фонду. Пасля камасацыі ў Шудзялаве і Навіцы гэтай зямлі будзе больш. Тады гурток пабудуе гаражы на машыны. У. Х.

У ШУДЗЯЛАЎСКІХ ВЕТЭРАНАЎ

18 лютага г.г. у Шудзялаве (Сакольскі павет) адбыўся агульна-гмінны сход членаў ЗБоВіД. Гурток ветэранаў у Шудзялаве налічвае 78 членаў. Гэта актыўны гурток і на яго сходах заўсёды ўдзельнічае 80—90 працэнтаў членаў.

Сход шудзялаўскіх ветэранаў абмеркаваў наступныя справы: працу ў 1972 годзе, дажынкі 1973 года ў Беластоку, святкаванне 30-й гадавіны Войска Польскага і 30-й гадавіны адраджэння Польшчы. Была таксама гутарка аб штодзённых жыццёвых клопатах ветэранаў.

На заканчэнне сход выбраў новыя ўлады гуртка. Старшынёй выбраны Баляслаў Рэцька, а намеснікам — Уладзімір Хомік.

Гуртон ЗБоВіД у Шудзялаве прыняў таксама рашэнне прыйсці з дапамогай у пабудове дома ветэрана ў Саколцы, якая пачнецца ў гэтым годзе.

Павятовыя ўлады ЗБоВіД прадстаўлялі на сходзе Станіслаў Мурзак і Юзэф Бляўскі. У. Х.

НА СХОДЗЕ Ў ТАПАЛЯНАХ


20 лютага г.г. у Тапалянах (Беластоцкі павет) адбыўся супольны сход ПАРП, ЗСЛ, ЗМВ, а таксама прадстаўнікоў усіх прадпрыемстваў, якія дзейнічаюць на гэтай тэрыторыі. Было 57 асоб.

Галоўная ўвага сходу была накіравана на недахопы. Між іншым, шмат крытычных заўваг было зроблена наконт інсемінацыі, класіфікатараў, рамонтаў машын у ПОМ-ах, лячэння жывёлы.

Былі таксама прапановы: увесці контрактацыю трускалак, ліквідаваць саламяныя стрэхі, прывесці ў парадак мясцовы луг, давесці да добрага парадку ўсе панадворкі і вуліцу, грамадскім чынам зажвіраваць школьную спартыўную пляцоўку.

Мікола Краўчук
Патока

ПАШТОЎКА З РЭПАРЦЁРСКАЙ ДАРОГІ



Кантрасты з Ячна Дуброўскага павету.

Фота Я. Цялушэцкага.



Ян Анацік, Бельск. Не згаджаемся, што «навука не мае ніводных мэт». Навошта ж тады такая навука? Калі вы хочаце знайсці рыфму да слова «свет», дык не хапайцеся за першае напаткаўшаеся слова. Рыфма павінна мець сэнс.

Мажэна. Ананімных вершаў, таксама, як і ананімных лістоў, не друкуем.

Яўген Гаўрылюк, Плёскі; Юрка Панасюк, Бельск; Мікалай Надзведзь, Семянкоўшчына; Павел Ляшкевіч, Бельск; Сцяпан Вышкоўскі, Аўгустова; Валя Анішчук, Гайнаўка; Яўгенія Кірылюк, Бельск; Сцёпа Палаўянюк, Бельск; Міра Лукша, Семяноўка. Вершы надрукуем.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Hełm Aleksandra Macedońskiego" (radz.) 13-14, „Zabijcie czarną owcę" (polski), 15-16, „Kopernik" (polski), cz. I i II. 17-18.

Параўка
„Polonez Ogińskiego" (radz.), „Ucieczka w milczenie" (NRD), 14-18.

Нарва
„Przez pustynię" (meksykański), „Szerokiej drogi kochanie" (polski), 14-18.

Чыжы
„Trup w każdej szafie" (czeski), „Bajka o Mrozie Czarodzieju" (radz.), 14-18.

Дубічы Царкоўныя
„Agent Nr 1" (polski), „Jaskółki" (węgierski), 14-18.

Арэшкава
„Kupujemy wóz strażacki" (NRD), „Szklana góra" (polski), 17-18.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„Gangsterzy i filantropi" (polski), „Ostatnia gra Karima" (radz.), 14.18.

Орля
„12 krzeseł" (radz.), „Perła w koronie" (polski), 14-18.

Райск
„Życie rodzinne" (polski), „Bajka o zmarnowanym czasie" (radz.), 14-18.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Крынкі
„Noc bez końca" (bułg.), 13-14, „Popierajcie swego szeryfa" (USA), 15-16, „Sąsiedzi" (polski), 17-18.

Шудзялава
„Doczekać zmroku" (USA), „Ulica Graniczna" (polski), 14-18.

Янаў
„Kopernik" (polski), cz. I i II. 14-18.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Jutro na orbitę" (radz.), 13-14, „Sokoły", (węgier.), 15-16, „Pilot helikoptera" (rumuński), 17-18

Мельнік
„Zwariowałeś Toni" (austr.), 13-14, „Zwariowana noc" (polski) 15-16, „Tam gdzie rośnie zielony bór" (jugosł.), 17-18.

Мілейчыцы
„Tajemniczy mnich" (radz.), 13-14, „Dwaj panowie bez parasola", (rum.), 15-16, „150 na godzinę" (polski), 17-18.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

„Księżniczka Czardasza", (węgier.), „Gang Olsena" (duński), 14-18.

Новы Двор

„Czarownica z bagien" (radz.), „Trzecia część nocy (polski), 14-18.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego

Adres redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1, Telefony: red. naczelny 2-10-33, centrala 2-32-41 do 45. Warunki prenumeraty: miesięcznie — 2,40 zł, kwartalnie — 7,20 zł, półrocznie — 14,40 zł, rocznie — 28,80 zł. Prenumeratę przyjmują wszystkie placówki pocztowe i listonosze. Wpłaty na prenumeratę indywidualną należy dokonywać na konto PUPiK „Ruch" Nr 102-7-161 NBP Białystok I Oddział Miejski. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Zamówienia ze zleceniem wysyłki za granicę przyjmuje — Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch" Warszawa, ul. Wronia 23. Nr konta PKO 1-6-100024. Zamówienia z krajów europejskich i zamorskich należy kierować pod adresem Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch", Warszawa, ul. Wronia 23.

BZGraf. Nakład 7.660 K-1

Як Кузьму крытыкавалі

Працуе цэх,
шчыруе цэх,
Ідзе ўсё чынна-гладка.
Ды завялася, як на грэх,
Адна авечка ў статку...

Глядзіш, там — глум,
а там — прастой,
Дзе трэба роўна — крыва...
Бо часта
ад «авечкі» той
На працы несла... півам.

І вось з павесткай грознай
сход —
Кузьму даць прачуханца,
Ды так узяць у абарот,
Каб і забыў аб п'янцы,
Каб і другога засцярог...

Актыў з'явіўся дружна
І ўсе, хто не прыйсці не мог
Па абавязку службы.

Усе, усе, хто толькі меў
Грамадскія нагрузкі,
Хто чаркі з роду не цярпеў
Ні пры якіх закусках.

У клубе гул,
у клубе шум,
Народу — не прабіцца...
— Дакуль рабіць ён будзе
глум?!
А нам — дакуль мірыцца?!

— Спрадвек:
дзе п'янка — там
і брак,
Яны — як брат з сястрою!..
— Калі ўжо кіне, ён, лайдак,
Браць... гэта... «для настрою»?!

— Ён ганьбіў нас ужо не раз
І гонар наш рабочы!..
— Як можа ён сядзець між нас
І нам глядзець у вочы?!
— Запляміў дружную сям'ю —
Усіх, хто ў гэтай залі!..
— Я праваліўся б скрозь
зямлю,
Каб мне вось так казалі!..

Кузьму ўшчувалі сяк і так,
Стаміліся пясочыць.

— Хай слова скажа сам
лайдак,
Хай людзям гляне ў вочы!..

Гукалі-клікалі — няма!
І пачалі дзівіцца:
Няўжо ад сораму Кузьма
Мог, праўда, праваліцца?!

На жаль, —
і сведкі ёсць таму, —
Не здарылася дзіва.
Калі «пясочылі» Кузьму,
Ён быў... ля бочкі з півам.

Генадзь Кляўко

НІЎКА

ЧАМУ?

Настаўнік:
— Мірка, скажы хуценька, жывёла якога паходжання найстарэйшая?
— Каза... Казёл...
— Чаму?
— Яны ж барадатыя!

ШТО

Медыцынская сястра са здзіўленнем глядзіць на ўрача, які безупынку смяецца.
— Вы ведаеце, што зараз будзе?
— Што?
— Да мяне на прыём прыйдзе інспектар аўтаінспекцыі, які ўчора зрабіў мне пракол на талоне.

МІНІБАЙКІ

А СУДДЗІ ХТО?

Пара хатніх жывёлін (не будзем называць па прозвішчу) падалі на развод.
Суддзі пытаюць:
— Прычына ёсць?
— Угу. Б'емося ілбамі.
— Сведкі ёсць?
— Ды не, мы між сабою, па-сямейнаму.
— Гэта суду недастаткова.
... З тых пор жывёліны (не будзем называць па прозвішчу) б'юцца толькі пры сведках.
Цяпер можна назваць прозвішчы: жывёліны аказаліся асламі.
А суддзі хто?

М. Азаў, У. Ціхвінскі

У БАРАЦЬБЕ ЗА ЦІШЫНЮ.

Ці не занадта?

КАЛІ НАМ ЗА ПЯЦЬДЗЕСЯТ

— Як здароўе?
— Ды так... Горш, чым было, але лепш, чым будзе.

ХТО ПРА ШТО

Сустрэліся дзве маладыя дзяўчыны і разгаварыліся:
— Ці ўжо маеш хлопца? — спытала першая.
— Не, дзяўчынку, — адказала другая.

УПЕРШЫНЮ

Пасля вяселля, адпраўляючы гасцей, маладая кажа:
— Добрыя людзі, мо што не так было на вяселлі, дык выбачайце. Я ж упершыню выходжу замуж. На другі раз лепш будзе...

У СУДЗЕ

— Вы ўдарылі мужа? — спытаў суддзя жонку.
— Не.
— Яна брэша! — крыкнуў муж.
— Змоўкні, бо дастанеш яшчэ, — не вытрымала жонка.

Прыкладны пляменнік

Я атрымаў новую кватэру. Цёплым чэрвеньскім вечарам прыехаў да мяне з Нівак мой пляменнік Вячык, каб павіншаваць з наваселлем.

З такой нагоды мая жонка наладзіла пачастунак. Сядзім, вячэраем, размаўляем. Вячык вельмі цікавы хлопец: разумны, дасціпны, добра выхаваны. Ён ужо студэнт, але ўявіце сабе, без дазволу маткі нават у кіно не ходзіць. «Мама, можна?» «Мама, дазвольце?» — і не інакш. Не тое, што цяперашнія — не пытаючыся, куды хочуць, туды ідуць, што хочуць, то і робяць. За гэта я і люблю яго.

Дзесьці каля дзесятай гадзіны за акном бліснула маланка, загрымела, і яксновы дождж паліў, як з вядра.

— Будзеш, Вячык, у нас начаваць. Куды ж табе ў такую далячынь ды ў такі дождж ісці.

— Сардэчна дзякую, — кажа Вячык, — толькі дазвольце, я на хвіліначку выскачу.

Чакалі мы яго, чакалі ды і ляглі спаць. Недзе каля апоўначы зазваніў званок. Я падхапіўся з ложка і да дзвярэй.

— Хто там?
— Гэта я, — чую голас Вячыка.

Адчыняю дзверы, а ён стаіць мокры і вінавата ўсміхаецца.

— А дзе ж ты быў? — пытаюся.
— А я бегаў дадому і папрасіў маму, каб яна дазволіла ў вас пераначаваць.

Ф. Макіўчук

Галаваломка

Сярод дванаццаці фігур знайдзіце дзве аднолькавыя.

1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

* ❊ *

Адказ на заданне з папярэдняга нумара: адрэзкі 2, 3 і 5.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

По просьбе Марысі і Веры Манцюк з Мікуліч змяшчаем песню

Nie jest źle jak na początek

Poszły w kąt cywilne łachy i miłostki,
wcielić cię zechcieli, bracie, do jednostki.
Z miejsca na zachętę dali nieco w kość,
chcesz więc wołać, że masz tego dość...
Przecież był w cywilu z ciebie kozak duży
i nie jednej belki możesz się dosłużyć.
Sam się zorientujesz już po paru dniach,
że za duże oczy ma twój strach.

Nie jest źle jak na początek,
nie trafiłeś wcale źle,
chociaż jeszcze nie w dziesiątkę,
gorzej można trafić też.
Nie jest źle, a będzie lepiej,
czemu by nie miało być?
Los nie lekko w plecy klepie,
ale śmiało można żyć.

Nieraz na ćwiczeniach wiatr ci dmuchnie w oczy,
słońce spali czoło, deszcz do cna przemoczy,
często na pogodę bierze cię już złość,
chcesz więc wołać, że masz tego dość...
Zwłaszcza na strzelnicy, gdy pod wiatr celujesz,
a cel w twoich oczach tańczy i wiruje,
zamiast w tarczę — trafisz często kulą w płot,
lecz nie zawsze, czasem w sosnę — ot!

Nie jest źle...

Twardy tydzień czujesz w kościach jak należy,
lecz w niedzielę wstajesz rześki, ach, i świeży,
patrzysz w okno, a tam pada jak na złość,
chcesz więc wołać, że masz tego dość...
A gdy się z dziewczyną spotkasz mimo wszystko
i odważnie spojrzysz już jej w oczy z bliska,
chociaż ona powie ci na pewno: nie! —
spojrzysz znowu i zobaczysz, że...

Nie jest źle...

ТОЛЬКІ ДЗЕСЯТУЮ...

Аднойчы багаты фінансіст праглынуў за абедам курыную костку, і яна засела ў яго ў горле. Задыхаючыся, ён прахрыпеў жонцы:

— Доктара!

Хутка прыехаў вядомы ўрач і выцягнуў костку.

— Дзякую, доктар — сказаў пацыент, — вы выратавалі мне жыццё і можаце прасіць любое ўзнагароджанне.

— Добра, — усміхнуўся ўрач, — дайце мне дзесятую частку таго, што вы хацелі мне прапанаваць, калі задыхаліся.

ПЕРАД ХАКЕЙНЫМ ЧЭМПІЯНАТАМ СВЕТУ.

Новае ў тактыцы хакея.

Курёзы

АРЛІНАЯ ПОШТА

З даўніх часоў жыхары горнай вёсачкі Ліуаха (Перу) карысталіся для сувязі з суседнімі вёскамі галубінай поштай. Нечакана летам мінулага года здарылася непапраўнае няшчасце. Арлы, спалоханыя магутнымі выбухамі ў гарах (дзе пракладвалася аўтамабільная дарога), пакінулі свае гняздоўі і пасяліліся паблізу Ліуаха. Зусім зразумела, пёрыстыя гіганты для пачатку знішчылі ўсіх галубоў.

Калі на мясцовай пошце накапілася шмат пісьмаў, усхваляваныя сяляне звярнуліся да ўлад. Тыя адмовіліся зрабіць што-небудзь, бо арол у Перу — такая ж свяшчэнная істота, як, напрыклад, у Індыі карова. На шчасце, выпадкова ў вёсцы гасцяў на канікулах Панча Рахелес, студэнт медыцынскага каледжа ў горадзе Ліме. З вялікай цяжкасцю малады псіхіятр злавіў 8 арлоў і... загіпнатызаваў іх. З таго часу вось ужо паўтара года Ліуаха карыстаецца паслугамі арлінай пошты. Цікава, што арлы лятаюць з пісьмамі не толькі днём, але і ноччу.

«ІНАНГІ» ВЫКОНВАЮЦЦА ШЭПТАМ

Бурундзі і Руанда — адзіныя ў свеце краіны, дзе спяваюць шэптам. Народныя балады «інангі», якія выконваюць шэптам пад акампанемент сітары, з'яўляюцца адным са старажытнейшых жанраў народнай музыкі. Некаторыя тлумачаць асаблівасці гэтага жанру тым, што гук сітары — народнага інструмента ў выглядзе авальнай выдаўбленай дошкі з 8—9 струнамі можа быць заглушан спеваком, калі той будзе спяваць у поўны голас.

Між намі

Калі вы выходзіце з сябе — ногі тут ні пры чым.